СВАБОДА І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — СВЯТЫЯ ДЛЯ КОЖНАГА З НАС!

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

4 ЛІПЕНЯ 2009 г. СУБОТА № 122 (26480)

Кошт 550 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СУСВЕТНАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ ПАВІННА АБ'ЯДНАЦЬ НАМАГАННІ ДЛЯ ПЕРААДОЛЕННЯ ГЛАБАЛЬНАГА КРЫЗІСУ І ІНШЫХ ВЫКЛІКАЎ

«У КОЖНАЙ СЯМ'І — СВАЯ ЎЛАСНАЯ ГІСТОРЫЯ ВАЙНЫ...»

Мы ўсе ведаем пра вайну. У некага гэта асабістыя ўспаміны, большасць, на шчасце, чулі пра яе толькі са слоў ветэранаў або чыталі ў падручніках па гісторыі. І калі спытаць каго, любы суразмоўца, напэўна, прыгадае канкрэтную бітву, прозвішча славутага военачальніка, увогуле Вялікую Перамогу. І будзе мець рацыю. Аднак вайна ўвайшла ў нашы жыцці, пакінула свой след і праз нейкія рэчы, падзеі, што сталі сімваламі — не ў глабальным сэнсе, а для кожнай сям'і асабіста — Вялікай Айчыннай. Для аўтара гэтых радкоў такі сімвал — ніколі не бачаны на ўласныя вочы, створаны выключна сілай уяўлення — мая маці, якой яшчэ не споўнілася і чатырох гадоў, на рудой карове. Напярэдадні самага вызвалення пасёлак пад Мінскам, па ўспамінах маіх цётак, палаў. Ратуючыся ад немцаў, і нават ад магчымага агню ад сваіх войскаў, што падыходзілі да сталіцы, насельніцтва кінулася хто куды. І мая маці ехала верхам на рагулі ў тыя самыя мясціны, куды мы цяпер любім хадзіць на шашлыкі і на рыбалку... Якія асабіста ў вас сімвалы мінулай вайны?

Ганна МІХАЙЛАВА, настаўніца Юркавіцкай сярэдняй школы Лагойскага раёна:

— Якое маё асабістае стаўленне да вайны?.. Адзін мой дзядзька прапаў на ёй без вестак, два другія вярнуліся інвалідамі. Да сямідзесяці гадоў «дацягнулі», але жылося ім нялёгка... На маю думку, пра вайну трэба менеї гаварыць, і, галоўнае, без залішняй пампезнасці. Вось сёння раніцай у тэлеэфіры маладая спявачка выконвала «Кацюшу». Песня ж цудоўная, але яе трэба «адчуваць». А як яе можа «адчуваць» зусім малады чалавек? Я калі бачу ў дзяцей пісталеты і аўтаматы — цацачную зброю — далі Бог, хочацца падысці, адабраць і паламаць яе. Я нават свайму ўнуку забараняла мець такія цацкі, хоць, безумоўна, былі ў яго і пісталеты, і мадэль танка, якая магла рухацца. Я разумею, што гэта цацкі, але яны ўсё адно прызначаны для забойства, хоць бы сабе і цацачнага. Паглядзіце, цяпер у кожным двары «страляюць»...

Валянцін КУШНЕР, пенсіянер, г. Орша:

— Вайна ёсць вайна... Я шмат чаго перажыў, доўга магу расказваць... Як хату спалілі, як пагналі ў Германію. Там у 1945 годзе нас і вызвалілі амерыканцы, потым перадалі рускім. Мяне адразу ў армію прызвалі, там жа — у акупацыйнай зоне ў Германіі — я і адслужыў свой тэрмін. Шмат чаго можна прыгадаць...

Наталля ПЯТРОЎСКАЯ, палявод СВК «Краснаселле» Талачынскага раёна:

— Я магу гаварыць пра вайну толькі са слоў сваёй маці. Ужо ў самым канцы вайны праз Коханава праходзілі немцы. І некаторыя спыніліся ў нашым доме. І дзядзьку ледзь не застрэлілі толькі за тое, што ён выказаўся супраць размяшчэння акупантаў. І дзед супакойваў, гаварыў, што каб не чапалі дзяцей — а ў сям'і было восем дзетак... А яшчэ дзядзька маці загінуў на фронце.

Мікалай ХАМЯНОК, старшыня Кляшчыцкага сельскага Савета Расонскага раёна:

— Адзін дзядуля прапаў без вестак на вайне, другі быў у палоне, ваяваў у партызанах. Маці напачатку знаходзілася ў лагеры для цывільнага насельніцтва, які быў створаны прама ў нашай вёсцы, потым яе вывезлі ў Прыбалтыку. Вось так вайна «зачапіла» амаль усіх, не абышла бокам. Зрэшты, як і многія іншыя сем'і. Што я вам гісторыю буду пераказваць! У кожнай сям'і была і ёсць свая асабістая гісторыя вайны. Я пачаў складаць генеалагічнае дрэва свайго роду, планую азначыць на ім усіх сваіх родных...

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. ЛУКАШЭНКІ на парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці і 65-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 3 ліпеня 2009 года

Таварышы салдаты і афіцэры!

Дарагія ветэраны!

Паважаныя суайчыннікі і госці Беларусі!

Роўна 65 гадоў таму беларуская сталіца была вызвалена ад гітлераўскіх акупантаў. Глыбока сімвалічна, што менавіта 3 ліпеня мы адзначаем Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, тым самым звязваючы разам святыя для кожнага з нас паняцці — Свабода і Незалежнасць.

Вызначыўшы гэту дату галоўным дзяржаўным святам, беларускі народ чарговы раз даказаў сваю мудрасць. Бо крыніцай нашага суверэнітэту з'яўляюцца не папяровыя дэкларацыі, не заявы так званых нацыянальных лідараў, а воля народа, яго павага да сваёй гераічнай гісторыі, да таго вельмі цяжкага і незабыўнага подзвігу мільёнаў салдат і афіцэраў, партызан і падпольшчыкаў, мірных грамадзян, якія перамаглі карычневую чуму.

Хоць гітлераўцам усё ж удалося прыйсці на нашу зямлю, але паставіць на калені беларускі народ яны так і не змаглі. Супраціўленне ворагу набыло сапраўды ўсенародны характар.

Акупантам процістаялі больш як 1тыс. 200 партызанскіх атрадаў, 4 тыс. падпольных арганізацый, якія аб'ядноўвалі звыш 400 тыс. чалавек.

Амаль паўтара мільёна ўраджэнцаў рэспублікі змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Больш як трыста з іх былі ўдастоены вышэйшага звання Героя Савецкага Саюза.

Узорам ваеннага майстэрства і адной з самых яркіх старонак усёй Другой сусветнай вайны стала стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён». Яе паспяховае правядзенне дало магчымасць не толькі выгнаць фашыстаў з беларускіх зямель, але і стварыць умовы для поўнага вызвалення еўрапейскага кантынента.

Мы памятаем і ганарымся подзвігам пакалення Пераможцаў.

Ветэраны Вялікай Айчыннай былі і застаюцца самымі паважанымі і шануемымі грамадзянамі нашай краіны. У ваенныя гады, нягледзячы на аб'ектыўна існуючыя супярэчнасці і розныя палітычныя ўстоі, заходнія краіны ў барацьбе з нацызмам знаходзіліся ў адным страі з савецкім народам.

Мы з цеплынёй успамінаем лётчыкаў легендарнай эскадрыллі «Нармандыя-Нёман», польскіх, славацкіх, чэшскіх, югаслаўскіх партызанаў-антыфашыстаў.

Гады Другой сусветнай вайны паказалі, што няма нічога больш каштоўнага, чым згуртаванасць і яднанне краін і народаў.

Сёння для пераадолення глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу, прадухілення распаўсюджвання ядзернай зброі, барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам міжнароднай супольнасці неабходна аб'ядноўваць намаганні, паслядоўна праводзіць справядлівую і міралюбівую палітыку.

У свеце не павінна быць звышдзяржаў, якія самі сябе надзялілі правам дыктаваць умовы, як жыць суверэнным і незалежным дзяржавам.

Кожны народ, кожная краіна маюць права на ўласны выбар свайго шляху развіцця. Гэта асноватворны прынцып міжнародных адносінаў.

Таму Беларусь як адна з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый імкнецца да збліжэння народаў. Мы катэгарычна супраць вырашэння любых канфліктаў ваенным шляхам.

Значнасць ролі нашай краіны ў гарантаванні бяспекі, падтрыманні міру ў еўрапейскім рэгіёне ні ў каго не павінна выклікаць сумненняў.

Вельмі важна, каб кожная дзяржава ўсведамляла сваю адказнасць перад сусветнай супольнасцю.

Беларусь нязменна верная традыцыям міру і добрасуседства. Мы лічым сваімі жыццёва важнымі інтарэсамі развіццё ўсебаковага і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з усімі дзяржавамі, захаванне і ўмацаванне існуючых сістэмаў міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. Паслядоўна праводзім збалансаваную шматвектарную знешнюю палітыку.

На жаль, апошнім часам з'явіліся спробы трактаваць прынцып шматвектарнасці амаль што як здрадніцтва саюзнікаў з боку Беларусі.

Не слабее імкненне праціўнікаў беларуска-расійскай інтэграцыі ўбіць клін у нашы адносіны.

Я неаднаразова гаварыў і яшчэ раз падкрэслю — і хачу, каб гэта пачулі, перш за ўсё, расіяне і кіраўніцтва Расіі: Беларусь не гандлюе дружбай з Расіяй. Мы — брацкія народы. Мы — адзін народ.

Наша агульная Вялікая Перамога і сённяшні юбілей, якія сімвалізуюць сумесны ўклад у разгром агрэсара, у вызваленне нашых народаў і ўсяго чалавецтва ад фашысцкага заняволення, тысячаразова перавышаюць узаемныя рознагалоссі і прэтэнзіі. Разам мы вырашалі і вырашым любыя праблемы.

За апошнія 15 гадоў рэспубліцы неаднаразова прадказвалі эканамічны крах і сацыяльныя ўзрушэнні. Але наш запас трываласці дастатковы.

На фоне сучасных канфліктаў, тэрарыстычных актаў, якія адбываюцца на розных кантынентах планеты, у Беларусі надзейна забяспечваюцца спакой і згода ў грамадстве, адзінства народа, абарона ад ваенных пагроз і іншых знешніх выклікаў.

Для таго каб так было і ў далейшым, мы паслядоўна і настойліва ўмацоўваем сваю нацыянальную бяспеку, у тым ліку абараназдольнасць.

Я хачу, каб беларускі народ ведаў, што наша армія добра ўзброеная і падрыхтавана для абароны сваёй краіны.

Нашы сыны, якія аддаюць воінскі доўг Радзіме, — гэта эліта грамадства. І мы павінны зрабіць усё, каб яны мелі самую сучасную зброю, былі сацыяльна абаронены, і самае галоўнае, каб салдацкія маці былі ўпэўнены ў іх шчаслівым лёсе.

Людзі ў пагонах у нашай краіне нязменна карыстаюцца даверам і павагай. Мы дабіліся таго, што служыць у беларускай арміі стала пачэсна і прэстыжна.

Дарагія ветэраны!

Нізкі паклон, шчырыя словы ўдзячнасці ўсім, хто не шкадаваў сябе на фронце і ў тыле, хто адразіў з руін і попелу родную зямлю, аднавіў народную гаспадарку.

Вы сумленна выканалі свой абавязак, вы адстаялі наша права быць грамадзянамі свабоднай краіны.

Няхай вечна гарыць агонь, запалены ў гонар бяспрыкладнага гераізму, гуманізму і духоўнай велічы савецкага салдата.

Дарагія суайчыннікі!

Сённяшняе свята — сімвал адзінства, мужнасці, велічы і стойкасці нашага народа, пераемнасці пакаленняў, вернасці абавязку.

Ён яшчэ раз нагадвае нам пра тое, што лёс Радзімы, яе сучаснае і будучае залежаць ад кожнага з нас. І свой абавязак перад Айчынай мы выканаем з гонарам. Гэтак жа, як нашы бацькі і дзяды.

Ад усёй душы віншую вас са знамянальнай датай нашай гераічнай гісторыі!

Слава беларускаму народу, які адстаяў незалежнасць краіны!

Вечная слава героям, якія палі ў баях з ворагам і аддалі свае жыцці за свабоду і шчасце будучых пакаленняў!

Гонар і слава абаронцам Айчыны!

Ура!

БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ ПРОЦІСТАЯЦЬ СПРОБАМ ЗНЯСЛАВІЦЬ ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ

Выступленне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. ЛУКАШЭНКІ на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 65-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дню Рэспублікі)

Дарагія суайчыннікі! Паважаныя замежныя госці!

У гэтыя ліпеньскія дні мы адзначаем 65-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І з замірaннем душы зноў і зноў вяртаемся да трагічных і гераічных старонак Вялікай Айчыннай вайны. Аналізуем яе маральныя і палітычныя ўрокі. Шукаем у гісторыі рэальныя адказы на выклікі сучаснасці.

Што значыць для кожнага з нас гэта дата?

Перш за ўсё, гэта гістарычная святыня і вялікае свята. Сімвал перамогі жыцця над смерцю, свабоды над рабствам, дабра над злом.

Яна стварае той светапоглядны і маральны фундамент, на якім мы будуем сваю суверэнную дзяржаву. Бо ў кожнага народа ёсць знамянальныя падзеі, якія навекі застаюцца ў яго памяці, жывяць пачуцці гонару і нацыянальнай годнасці.

Менавіта барацьба за вызваленне ад фашызму набыла лёсавызначальнае значэнне для беларускага народа. Выкавала лепшыя рысы нацыянальнага характару — патрыятызм, свабодалюбства, веру і аптымізм, якія дапамагалі і дапамагаюць пераадольваць любыя цяжкасці.

Разумеючы гэта, наш народ на рэспубліканскім рэферэндуме вызначыў 3 ліпеня галоўным дзяржаўным святам — Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Гэта гістарычная дата — нагода для нас успомніць аб тым, што літаральна ўся краіна была ператворана фашысцкімі агрэсарамі ў руіны. Былі разбураны больш як дзве сотні гарадоў і раённых цэнтраў. Знішчаны амаль дзесяць тысяч вёсак і пасёлкаў, сотні з іх спалены разам з людзьмі. На месцы сённяшняга святочнага Мінска стаяла толькі некалькі паўразбураных будынкаў.

Акупанты ўчынілі на беларускай зямлі страшэнны канвеер смерці, стварыўшы 260 канцэнтрацыйных лагераў і 110 гета. Правялі звыш 140 карных аперацый супраць партызанаў і мірнага насельніцтва.

Гэта — падстава ўспомніць аб тых вялікіх і незаменных стратах, якія панёс народ Беларусі ў час вайны. Яны адчувальныя да гэтага часу, трагедыя закранула практычна кожную сям'ю. У пажары вайны згарэла жыццё кожнага трэцяга нашага земляка.

Нас магло б быць 30 мільёнаў. Багатая беларуская зямля пракарміла б усіх. Але на працягу больш як паўстагоддзя нам не ўдаецца папоўніць панесеныя людскія страты.

Мы толькі цяпер падыходзім да таго, каб колькасць насельніцтва не скарачалася, а расла.

Сёння, адзначаючы свята, мы аддаём даніну памяці ўсім загінулым — героям-вызваліцелям і бязвінным ахвярам гэтай крывавай бойні.

І, нарэшце, гэта нагода ўспомніць аб тым, што беларускі народ не быў зламаны і пакораны.

Фашысцкія войскі не змаглі затрымаць ні магутная французская лінія Мажыно, ні глыбокія галандскія каналы, ні высокія грэчаскія горы. Смерць захопнікам неслі беларускія лясы, балоты і раўніны.

З ворагам змагаліся ва ўсіх кутках краіны. Беларускія гарады і пасёлкі ператварыліся ў рубяжы абароны. Цуды мужнасці і гераізму праявілі гарнізон Брэсцкай крэпасці і байцы пагранатрада пад Гроднам. Савецкія войскі пры падтрымцы мясцовага насельніцтва да апошняга процістаялі ворагу пад Бабруйскам, Жлобінам, Рагачовам, Гомелем, Віцебскам і Оршай.

Прыкладам усенароднай барацьбы стаў Магілёў. 40 тысяч жыхароў узводзілі абарончыя рубяжы вакол роднага горада. 23 дні адчайна супраціўляліся варожаму кальцу, што сціскалася вакол іх. А некаторыя ж еўрапейскія сталіцы здаваліся захопнікам без адзінага выстралу.

Акупаваная, але непакораная Беларусь праявіла сябе як небывалы ў свеце феномен усенароднага супраціўлення агрэсару.

На барацьбу з ворагам узняліся ўсе — ад малога да вялікага, незалежна ад полу, нацыянальнасці і веравызнання. Паводле даных аўтарытэтных замежных ваенных крыніц, беларускія партызаны і падпольшчыкі за час Другой сусветнай вайны нанеслі гітлераўцам большы ўрон, чым саюзніцкія войскі ў Еўропе. Такога магутнага патрыятычнага парыву не было ні ў адной з захопленых фашыстамі дзяржаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КАЛЯ 500 ТЫС. ЧАЛАВЕК ПРЫЙШЛІ Ў ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НА ПАРАД У МІНСКУ

Галоўнымі ўдзельнікамі ўрачыстага шэсця традыцыйна сталі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны.

У парадзе ўзялі ўдзел каля 3 тыс. вайскоўцаў. Перад мінчанамі і гасцямі беларускай сталіцы прайшоў 21 парадны разлік, у складзе якога сваю страявую выпраўку прадэманстравалі выхаванцы Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча, вайскоўцы роты ганаровай варты Узброеных Сілаў, 120-й гвардзейскай асобнай механізаванай брыгады, курсанты і слухачы Ваеннай акадэміі Беларусі, воіны 86-й брыгады сувязі, транспартных войскаў і пагранічнага камітэта Беларусі, вайскоўцы сілаў спецыяльных аперацый беларускай арміі, унутраных войскаў і МНС. Была задзейнічана сучасная ваенная тэхніка Узброеных Сілаў і ўзоры тэхнікі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Сваё майстэрства ў складзе паветранага эшалона парада прадэманстравалі пілатажныя групы «Крылы Беларусі» і «Белая Русь». Каля 4 тыс. чалавек узялі ўдзел у святочным тэатралізаваным спартыўна-моладзевым шэсці.

БЕЛТА.

ISSN 1990 - 763X

Дзмітрый Мядзведзеў павіншаваў беларускі народ з 65-годдзем вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў павіншаваў увесь беларускі народ з 65-й гадавінай вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, паведамілі ў прэс-службе Крамля.

«Гэта сапраўды вялікая дата нашай агульнай гісторыі, — гаворыцца ў віншаванні. — Буйнейшая ваенная аперацыя «Баграціён» па вызваленні Беларусі дала магчымасць савецкім войскам выйсці да межаў Радзімы. Паспяховае наступленне мела вялікае стратэгічнае значэнне для выгнання агрэсара з роднай зямлі. А ў канчатковым выніку — для будучай Перамогі».

Дзмітрый Мядзведзеў падкрэсліў, што памяць аб гэтым подзвігу — свяшчэнная для нашых народаў, якія цаной вялікіх стратаў адстаялі свабоду і незалежнасць агульнай Айчыны. Ён адзначыў, што вельмі важна берагчы пранесеныя праз цяжкія выпрабаванні дружбу і ўзаемную павагу, якія застаюцца надзейнай асновай для далейшага развіцця нашых сувязяў. «Цвёрда настроены на паслядоўную рэалізацыю курсу на далейшае ўмацаванне эканамічнай базы расійска-беларускіх адносінаў, нарошчванне ўзаемадзеяння ў сацыяльнай і гуманітарнай сферах, у галіне абароны і бяспекі, у міжнародных справах», — падкрэсліў Прэзідэнт Расіі.

«Перакананы, што гэты падыход адпавядае інтарэсам сацыяльнага і дэмакратычнага прагрэсу, садзейнічае далейшаму павышэнню дабрабыту грамадзян Расіі і Беларусі, умацаванню іх духоўнага, культурнага і гістарычнага адзінства», — гаворыцца ў пасланні Дзмітрыя Мядзведзева.

Вянок ад Прэзідэнта Беларусі ўскладзены ў Маскве да Магілы Невядомага салдата

Вянок ад Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ўскладзены ў Маскве да Магілы Невядомага салдата каля Крамлёўскай сцяны. Ва ўрачыстай цырымоніі, прысвечанай 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню Незалежнасці, прынялі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Васіль Далгалёў, міністр замежных спраў РФ Сяргей Лаўроў, намеснік дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Васіль Хрол, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, дыпламаты, прадстаўнікі інтэграцыйных органаў і грамадскасці. Былі ўстаноўлены таксама карзіны кветак да памятных знакаў «Горад-герой Мінск», «Брэсцкая крэпасць-герой». З нагоды юбілею вызвалення Беларусі вянок ад свайго імя ўсклаў да Магілы Невядомага салдата кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства Сяргей Лаўроў.

Цырымонія прайшла ва ўрачыстай абстаноўцы — з праходжаннем роты Ганаровай варты і ваеннага аркестра, з выкананнем дзяржаўных гімнаў Беларусі і Расіі. Васіль Далгалёў назваў сімвалічным той факт, што сёння было праведзена сумеснае ўскладанне вянкоў. «Мы разам з брацкай Расіяй дружна выступаем і на сусветнай арэне», — адзначыў дыпламат, дадаўшы, што сённяшняе свята з'яўляецца пралогам да святкавання ў будучым годзе 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

БЕЛТА.

Аляксандра Лукашэнку з нагоды Дня Незалежнасці павіншавалі Лізавета II, генеральны сакратар ААН і іншыя вядомыя палітыкі

З нагоды Дня Незалежнасці ў адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі прыйшлі шматлікія віншаванні ад замежных палітычных і грамадскіх дзеячаў.

У ліку кіраўнікоў дзяржаў СНД, якія павіншавалі Аляксандра Лукашэнку і ў яго асобе беларускі народ, — прэзідэнты Расіі, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Узбекістана. Віншавальныя паслянні накіравалі таксама прэзідэнты ФРГ, Індыі, Ірландыі, Сербіі, Сірыі, Францыі, Швейцарскай Канфедэрацыі, Балгарыі, Грэцыі, Алжыра, кіраўнікі Лівіі і Кубы. Свае віншаванні выказалі Каралева Вялікабрытаніі Лізавета II, Старшыня КНР Ху Цзіньтао, генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Выплата матэрыяльнай дапамогі ветэранам ВАВ да 65-годдзя вызвалення Беларусі практычна завершана

Выплата матэрыяльнай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны ў сувязі са святкаваннем 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў практычна завершана. Аб гэтым паведаміў вядучы спецыяліст аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацабароны Віктар Зімакоў.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 224 выплаты ветэранам ВАВ і асобам, якія пацярпелі ад яе наступстваў, пачаліся з 1 чэрвеня гэтага года. Яны ажыццяўляліся са сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Памер матэрыяльнай дапамогі дыферэнцыраваны — ад Br150 тыс. да Br300 тыс. Паводле аператыўных даных, на гэтыя мэты ўжо зрасходавана каля Br9 млрд. Матэрыяльную дапамогу атрымалі амаль 95 працэнтаў жыхароў краіны гэтай катэгорыі. Астатнія грамадзяне Беларусі, якім назначана матэрыяльная дапамога, адсутнічалі па месцы жыхарства на момант выплаты — знаходзіліся на адпачынку, лячэнні, у гасцях і г.д. Ім выплата будзе праведзена ў бліжэйшы час.

БЕЛТА.

Ю. Жадобіну і В. Зайцаву прысвоена чарговае воінскае званне генерал-лейтэнанта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 ліпеня падпісаў указы аб прысваенні чарговых воінскіх і спецыяльных званняў.

У прыватнасці, чарговае воінскае званне генерал-лейтэнанта прысвоена генерал-маёру Юрыю Жадобіну і генерал-маёру Вадзіму Зайцаву.

Палкоўнікам Станіславу Засю, Андрэю Гарульку, Ігару Лаўрыненку прысвоена чарговае воінскае званне генерал-маёра.

Прэзідэнт таксама прысвоіў палкоўніку ўнутранай службы Аляксандру Ганчарову чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра ўнутранай службы, намесніку старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Леаніду Досаву — персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Другі транш крэдыту МВФ паступіў у Беларусь у поўным аб'ёме — каля $680 млн

Аб гэтым паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.

Нагадаем, 29 чэрвеня Савет дырэктараў Міжнароднага валютнага фонду адобрыў павелічэнне аб'ёму крэдытнай праграмы «стэнд-бай» для Беларусі на $1 млрд да $3,52 млрд. Акрамя таго, было прынята рашэнне выдзеліць чарговы транш крэдыту нашай краіне ў аб'ёме $679,2 млн.

У студзені Беларусь ужо атрымала каля $800 млн. Такім чынам, агульны аб'ём прадастаўленага МВФ крэдыту склаў $1,48 млрд.

БЕЛТА.

Калектыў газеты «Звязда» глыбока смуткуе і выказвае шчырыя спачуванні няштатнаму супрацоўніку рэдакцыі Уладзіміру Сычову ў сувязі з напаткаўшым яго непапраўным горам — смерцю СЫНА.

«У КОЖНАЙ СЯМ'І — СВАЯ ЎЛАСНАЯ ГІСТОРЫЯ ВАЙНЫ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Галіна ТРУБІЛА, спецыяліст па зваротах грамадзян раённага камунальнага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства «Бярэзінскае ЖКГ»:

— У мамы на вайне загінулі два браты, ім было па 22 гады. Іх партрэты і дагэтуль вісяць у доме маці. Дзядуля быў інвалідам Вялікай Айчыннай, дзядзька прайшоў вайну. Апошні часта паўтараў: галоўнае на вайне — не падаць духам. І яшчэ гаварыў, што на вайне каму як пашанцуе: кагосьці ні разу не зачэпіць, а некага і не адзін раз можа параніць. Што такое вайна? Акопы, бруд, вошы... Нашым жа мужам давялося служыць на афганскай мяжы, калі там была вайна. На пагранічнай заставе таксама былі акопы... Але, я гэта добра памятаю, афіцэры не падалі духам.

Ларыса КАРПУК, выканаўца абавязкаў загадчыка аддзялення камунальнай гігіены дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя»:

— Мой дзядуля па лініі маці быў расстраляны немцамі. Другі дзядуля ваяваў, прайшоў усю вайну, быў героем вайны. На жаль, яго ўжо няма...

Рыгор МІСКОВІЧ, галоўны інжынер Кобрынскага мясакамбіната:

— У нашай сям'і практычна ніхто не ваяваў. Толькі матчынай сястры муж, які быў артылерыстам, дайшоў да Берліна. Бацька падчас вайны быў зусім малы, яму пры вызваленні толькі дзевяць споўнілася. І вось па яго ўспамінах, па ўспамінах дзеда я ведаю: было прадчуванне вызвалення. Калі пачалася вайна, усё адбылося раптоўна, танкі па горадзе чужыя ездзілі ўжо праз некалькі дзён. А тут людзі ведалі і чакалі гэтага моманту. Як сімвал тых часоў, як памяць у мяне дома захоўваецца савецкая каска перыяду Вялікай Айчыннай. Яна сапраўдная, я знайшоў яе цесця на Магілёўшчыне, а ён гаварыў, што знайшоў яе ў лесе. Яна мела прабоіну ў верхняй частцы, відавочна, ад асколка...

Сяргей СТАРЫНАЎ.



Пасля заканчэння ўрачыстасцяў у Палацы Рэспублікі кіраўнік дзяржавы ўзяў удзел у цырымоніі ўскладання вянкоў на плошчы Перамогі.

БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ ПРОЦІСТАЯЦЬ СПРОБАМ ЗНЯСЛАВІЦЬ ВЯЛІКУЮ ПЕРАМОГУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Памяць аб пяражытых народам пакутах, яго мужнасці і стойкасці і сёння надае нам мудрасці і светаразумення. Яна падказвае, як пераадольваць цяжкасці, атрымліваць урокі са складаных сітуацый. І ў выніку — перамагаць.

Дарагія сябры! 65 гадоў для гісторыі — гэта адно імгненне. Але для нас гэта вельмі цяжкія гады пасляваеннага адраджэння рэспублікі, аднаўлення яе эканамічнага і чалавечага патэнцыялу, набыцця незалежнасці і дастойнага месца ў сусветнай супольнасці. Мільёны людзей, аб'яднаныя агульным імкненнем зрабіць жыццё лепшым, здзяйснялі не менш значныя подзвігі на працоўным фронце.

Дзякуй Богу, жывы яшчэ тварцы гэтай Вялікай воінскай і працоўнай Перамогі, якія могуць расказаць пра той суровы і гераічны час.

Нам гэта неабходна. Таму што наша задача як нашчадкаў і наследнікаў пакалення пераможцаў — атрымаць урокі з гісторыі. Зрабіць так, каб трагедыя больш не паўтарылася, каб краіна жыла ў міры і дабрабыце.

Асэнсоўваючы сёння гэту вялікую гістарычную дату, якая дала адлік нашай сапраўднай незалежнасці, я хацеў бы падзяліцца з вамі некаторымі разважаннямі. Магчыма, яны выходзяць за рамкі агульнапрынятых святочных прамоў, але мы не зможам зберагчы дзяржаву, калі цвёрда не засвоім запаведзі гісторыі.

Самая галоўная з іх у тым, што веліч і стойкасць народа вызначаюцца не матэрыяльнымі рэсурсамі, а яго сілай духу і згуртаванасцю.

Менавіта дзякуючы гэтаму беларусы дастойна вытрымалі вельмі цяжкія выпрабаванні ваеннага ліхалецця. Перажылі чарнобыльскую катастрофу, геапалітычную трагедыю развалу СССР. Выбралі і адстаялі свой шлях развіцця, не спалохаўшыся санкцый, палітычнага і эканамічнага націску з боку звышдзяржаў і некаторых міжнародных арганізацый. Не паддаўшыся паніцы глабальнага крызісу, па-дзелавому пераадольваюць яго негатыўныя наступствы.

Усё гэта не адбываецца само па сабе. Беларусы пераканаўча паказалі свету, што мы — адзіная згуртаваная сям'я, якая зможа справіцца з любымі праблемамі.

Вядома, было б саманадзейна гаварыць аб тым, што ў нас няма ніякіх цяжкасцяў.

Сёння беларусам у гэтым навязаным звонку крызісе вельмі няпроста. Аднак дзякуючы антыкрызіснай дзяржаўнай палітыцы ні адно айчыннае прадпрыемства мы не закрылі. Няхай і ў невялікім памеры, але нам удаецца забяспечваць прырост валавога ўнутранага прадукту. І гэта на фоне яго рэзкага зніжэння ў многіх краінах свету.

Людзі захоўваюць рабочыя месцы, мы спрабуем утрымліваць беспрацоўе на дакрызісным узроўні. У дамы і кватэры бесперабойна паступаюць святло і цяпло. Дзяржава сумленна выконвае ўсе абавязацельствы перад маладымі і шматдзетнымі сем'ямі, сацыяльна не абароненымі грамадзянамі.

Другі не менш важны завешчаны нам урок — гэта неабходнасць захавання гістарычнай памяці. Бясцэнны вопыт Вялікай Перамогі — духоўная аснова выхавання грамадзян.

На жаль, сёння знаходзіцца нямала жадаючых сказіць падзеі Другой сусветнай вайны і тым самым украсці Вялікую Перамогу і выбіць маральную аснову ў нашага народа. Самае агіднае кашчунства — гэта тэзіс аб тым, што на тэрыторыі Беларусі нібыта мела месца не ўсенародная вызваленчая барацьба, а грамадзянская вайна паміж абаронцамі савецкай улады і прыхільнікамі «новага еўрапейскага парадку».

Такія лжывыя сцвярджэнні ніколі не знойдуць падтрымку на шматпакутнай беларускай зямлі. Мы будзем процістаяць спробам знясławіць Вялікую Перамогу і сказіць гераічны летапіс нашай краіны.

Нам, на шчасце, не трэба ствараць спецыяльныя камісіі па захаванні гістарычнай памяці. Таму што мы нікому ў свой час не дазволілі ўзняць руку на нашу Перамогу, на ветэрана з ордэнскімі планкамі, на чалавека ў ваеннай форме.

Беларусь сёння — адзіная краіна на постсавецкай прасторы, дзе ў школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах вывучаецца курс «Вялікая Айчынная вайна». Ужо адзін гэты факт гаворыць сам за сябе.

Дзясяткі тысяч піянераў і членаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі па добрай волі дапамагаюць ветэранам, падтрымліваюць парадак на мемарыялах і ў месцах воінскіх пахаванняў, удзельнічаюць у патрыятычных акцыях.

Новае пакаленне беларусаў мае актыўную грамадзянскую пазіцыю і здольнае даць рашучы адпор прапагандыстам неанацысцкіх і расісцкіх поглядаў. Мы ніколі не змірымся з тым, што недзе ў суседніх краінах ушаноўваюць фашысцкіх памагатых як герояў. Гэта нязмыўная ганьба для любой нацыі.

Павага да мінулага Айчыны, непарыўная сувязь і пераемнасць пакаленняў — вось тыя традыцыйныя асновы, на якіх трымалася і трымаецца стабільнасць і дабрабыт Беларусі.

Каб увекавечыць подзвіг абаронцаў нашай краіны, напярэдадні свята Вызвалення дваццаць два населеныя пункты былі ўпершыню ўзнагароджаны вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Паважаныя таварышы! Наўрад ці ў каго-небудзь з прысутных у зале ўзнікне праблема з адказам на пытанне: чаму Савецкі Саюз вытрымаў удар і перамог перавышаючыя сілы агрэсара? Таму што СССР быў сапраўдным аб'яднаннем рэспублік, заснаваным на прынцыпах вельмі цеснага адзінства, роўнасці, узаемадзеяння і ўзаемадапамогі брацкіх народаў.

Сёння, цалкам падтрымліваючы і развіваючы інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, мы павінны дакладна ўсведамляць, што не штучныя ўтварэнні змогуць зблізіць нашы брацкія народы і забяспечыць іх дабрабыт. Да гэтай высакароднай мэты прывядуць канкрэтныя захады ў эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і іншых сферах. Захады, якія павінны быць сцэментаваны рэальнай палітычнай воляй кіраўніцтва адпаведных дзяржаў. Гэты вопыт мы таксама атрымалі з асэнсавання нашага мінулага.

Незалежная Беларусь будзе самым актыўным удзельнікам тых саюзаў, якія грунтуюцца на ўзаемападавазе, раўнапраўных, шчырых адносінах, адзінстве мэтаў. Але ні ў якім выпадку не на дыктаце, манапалізме або шантажы.

І гэта датычыцца ўсіх міжнародных і рэгіянальных аб'яднанняў, ці гэта ААН, Еўрасаюз, Савет Еўропы, СНД або іншыя структуры.

З нашага гістарычнага мінулага вынікае яшчэ адзін урок, ад засвавання якога залежыць лёс краіны. Беларусь вельмі часта ператваралася ў арэну войнаў і канфліктаў розных дзяржаў. Полчышчы захопнікаў прыходзілі то з Захаду, то з Усходу. І наша зямля часам станавілася разменнай манетай у геапалітычных спрэчках.

Мы не хочам, каб так было ў далейшым!

Беларусь знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы. І гэтым усё сказана. Нам самім лёсам наканавана быць сувязным мостам паміж Усходам і Захадам.

Для нас непрымальна любая кан'юнктура, жаданне дружыць з кімсьці супраць кагосьці, спекуляваць на міждзяржаўных супярэчнасцях. Таму мы супрацоўнічаем з нашымі традыцыйнымі партнёрамі, але працягваем руку і тым, хто хоча бачыць у нас добрых і шчырых сяброў.

Аб гэтым сведчаць нашы ўзаемаадносіны з Кітаем, Індыяй, дзяржавамі Сярэдняй Азіі, Блізкага Усходу, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Адкрыты характар нашай краіны, яе эканоміка, гісторыя і культура патрабуюць, перш за ўсё, цеснага і збалансаванага ўзаемадзеяння з усімі суседзямі.

Я не раз гаварыў, што суседзяў не выбіраюць, яны дадзены нам ад Бога. І нам трэба жыць з імі ў міры і згодзе. Падкрэслю: з усімі суседзямі!

Расія — наш стратэгічны партнёр, і мы будзем імкнуцца да развіцця сапраўды саюзніцкіх адносінаў з ёю. Сапраўды саюзніцкіх раўнапраўных адносінаў! Ставячы іх вышэй за «цукровыя», «малочныя» і да таго падобных дробязных спрэчак.

Далейшае развіццё атрымлівае прагматычнае супрацоўніцтва з дзяржавамі Еўрасаюза.

За апошнія некалькі дзесяцігоддзяў Еўропа змагла сканцэнтраваць каласальныя фінансавыя, вытворчыя і інтэлектуальныя рэсурсы. І гэта адбылося ў многім дзякуючы таму, што перыяд халоднай вайны змяніўся паскораным і маштабным аб'яднаннем. Аднак гэты станоўчы па сваёй сутнасці працэс мае і адваротны бок.

Магчыма, камусьці з нашых еўрапейскіх партнёраў не спадабаецца тое, што я цяпер скажу, але, прынамсі, гэта будзе сумленна і шчыра з майго боку.

На жаль, у гэтай новай, аб'яднанай, Еўропе ў пагоні за геаграфічным пашырэннем стала страчвацца жаданне разумець іншыя народы, іх нацыянальныя асаблівасці, культуры і існуючыя дзяржаўныя традыцыі. Сёння там думаюць больш аб нейкіх фармальных рамках працэсу, чым аб яго змесце.

Часта ацэнку нашай краіне даюць тыя, хто нават не можа паказаць яе на карце. Не гаворачы ўжо аб тым, што яны зусім не ведаюць аб тых пакутах, якія перажыла Беларусь у час Другой сусветнай вайны, якія наступствы чарнобыльскай аварыі мы адчуваем да гэтага часу.

Нельга высакамерна ставіцца да іншых народаў і дзяржаў і лічыць, што толькі ўніфікаваны еўрапейскі шлях развіцця правільны, а астатнія — непаўнацэнныя.

Народы розныя, і шляхі ў іх павінны быць розныя. Але з гэтага не трэба рабіць праблему і падганяць усіх пад адзін шаблон. Гісторыя ведае бесперспектыўнасць і небяспеку такіх памкненняў.

Успомнім, што рэжым фашызму ў Германіі ўстанаўліваўся праз дэмакратычныя працэдуры, праз свабоду слова і мітынгаў. Але калі ў таго грамадства быў бы імунітэт супраць такога развіцця падзей, то не было б акупацыі Парыжа, варварскіх бамбардзіровак Лондана. Не было б Асвенціма, Бухенвальда, Трасцянца. Значыць, ёсць рэчы больш важныя, чым фармальнае выкананне абстрактных дэмакратычных прынцыпаў. Гэта — чалавечае жыццё.

Сёння для ўсіх еўрапейцаў галоўным павінна быць разуменне агульных мэтаў і задач, імкненне рухацца да іх дасягнення.

Відавочным становіцца, што Беларусь не павінна капіраваць заходнюю палітычную сістэму.

Больш прадукцыйны шлях у агульны еўрапейскі дом — сумесны ўдзел у папярэджанні новых выклікаў і пагроз часу. У вырашэнні сусветных фінансава-эканамічных праблем, у барацьбе з тэрарызмам, наркатрафікам, гандлем людзьмі і ў цэлым шэрагу іншых пытанняў, якія самым непасрэдным чынам закранаюць інтарэсы мільёнаў і мільёнаў людзей. А перапалкі наконт таго, чый парламент лепшы, дзе больш дэмакратыі і правоў чалавека, — гэта шлях у нікуды, у тупік.

Канфрантацыя нікому карысці не прынясе. Яна толькі паставіць пад пагрозу магчымасць стварэння справядлівага светапарадку.

Радуе, што апошнім часам у Еўрасаюзе пачынаюць разбурацца стэрэатыпы прадузятых адносінаў да Беларусі. Прыходзіць разуменне, што наша краіна — неад'емная частка Еўропы, прычым з уласным голасам. Шчыра спадзяюся, што гэтыя станоўчыя тэндэнцыі знойдуць сваё далейшае развіццё.

І яшчэ адна думка аб гістарычных уроках. Шмат апошнія гады гаворыцца аб глабалізацыі. Маўляў, яна прынясе ўсім краінам роўныя магчымасці для дынамічнага развіцця, а народам — даброты заходняй цывілізацыі.

І што мы маем у сапраўднасці?

Бедныя сталі яшчэ бяднейшымі, а багатыя як былі багатымі, так і засталіся. Ніякія транснацыянальныя карпарацыі не прыўнеслі ў сусветную супольнасць шчасце і дабрабыт. У кожнай з іх галоўным быў прыватны інтарэс захавання свайго прыбытку, а не лёсы людзей, якія сталі беспрацоўнымі.

Менавіта глабалізм спарадзіў ланцуговую рэакцыю, што ўцягвае ўсе краіны ў сусветны крызіс.

Сусветныя антыкрызісныя саміты, якія ўвайшлі апошнім часам у моду, толькі пацвярджаюць фальшывасць пафасных заяў аб існуючай глабальнай салідарнасці. На словах заклікаючы адзін аднаго аб'ядноўваць намаганні і сумесна пераадольваць крызіс, на справе ўсе кінуліся ўзводзіць міждзяржаўныя бар'еры і аб'яўляць гандлёвыя войны.

Аналіз гэтых рэалій пераконвае ў правільнасці выбранага намі прынцыпу — апірацца трэба толькі на свае сілы, а не спадзявацца на некага збоку.

Формула суверэнітэту Беларусі складаецца з двух раўназначных паняццяў — адказнасці і свабоды.

На іх аснове мы змаглі пабудаваць моцную дзяржаву, забяспечыць дастойны ўзровень жыцця насельніцтва, захаваць грамадскі мір і згоду. Зарэкамендаваць сябе надзейным і прыстойным міжнародным партнёрам.

І тое ліхалецце, якое мы перажываем цяпер, мы пераадолеем. Я ў гэтым цвёрда перакананы.

Дарагія ветэраны!

Сучасная Беларусь знаходзіцца ў неаплатным даўгу перад вамі за тое, што вы выратавалі свет ад карычневай чумы, аднавілі нашу краіну, падарылі жыццё цяперашняму і будучым пакаленням. У гэта светлае свята мы абяцаем вам, што збережам самую каштоўную спадчыну Вялікай Перамогі — нашу свабодную і незалежную Беларусь. *(Апладысменты)*.

Зробім усё, каб Беларусь была працвітаючай дзяржавай. Каб наша грамадства служыла ўзорам грамадзянскага міру і спакою, дзе няма месца сацыяльнаму, нацыянальнаму і рэлігійнаму разладу. Каб і ў далейшым ветэраны Вялікай Айчыннай, усе пажылыя людзі карысталіся пашанай і ўвагай, маглі разлічваць на дапамогу дзяржавы ў вырашэнні сваіх праблем.

Нізкі вам, паважаныя ветэраны, паклон і ўдзячнасць за ўсё, што вы зрабілі для нас. Жывіце як мага даўжэй і шчаслівa. *(Апладысменты)*.

Дарагія сябры!

Вялікае ў нас свята. У няпросты час, але вялікае свята. І мы цвёрда прынялі рашэнне адзначыць яго, як належыць славянскаму народу.

І я ад усяго сэрца віншую вас з 65-годдзем Вызвалення і Днём Незалежнасці Беларусі.

Вялікі дзякуй замежным ветэранам, якія змагаліся за Беларусь, замежным сябрам і партнёрам, якія разам з намі сустракаюць вялікае свята.

Няхай гэтыя ўрачыстасці ўвойдуць у навейшую гісторыю краіны як сімвал народнага адзінства, уздыму патрыятычнага духу і згуртаванасці грамадзян.

Моцнага вам здароўя, новых працоўных дасягненняў, шчасця і сямейнага дабрабыту.

Са святам, дарагія сябры! *(Апладысменты)*.

Юбілейныя медалі ўручаны работнікам прадпрыемстваў інфармацыі і друку

Юбілейныя медалі «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» уручаны 2 ліпеня работнікам прадпрыемстваў інфармацыі і друку.

Практычна ўсе беларускія прадпрыемствы галіны дастойна працуюць, нягледзячы на не самыя камфортныя ўмовы, што склаліся сёння ў сусветнай эканоміцы, адзначыў, вітаючы прысутных на цырымоніі, кіраўнік Міністэрства інфармацыі Уладзімір Русакевіч. У адзінстве, згуртаванасці ўсіх і кожнага — крыніца поспеху, сілы і працвітання краіны, сказаў ён.

Сярод тых, хто ўзнагароджаны юбілейнымі медалямі да 65-годдзя вызвалення Беларусі, людзі, якія шмат гадоў працуюць на карысць галіны. Прэстыжныя ўзнагароды атрымалі першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч, намеснікі міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак і Аляксандр Слабадчук, галоўныя рэдактары газет «Звязда» і «Народная газета» Уладзімір Наркевіч і Уладзімір Андрыевіч, дырэктар РВУ «Літаратура і мастацтва» Аляксандр Карлюкевіч, галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі, дырэктар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Таццяна Бялова і іншыя.

Забудоўшчыкі жылля ў Беларусі будуць публікаваць праектныя дэкларацыі не менш як за 7 дзён да заключэння дагавораў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 ліпеня падпісаў указ № 367 «Аб некаторых пытаннях жыллёвага будаўніцтва».

Указам устаноўлена, што прыцягненне забудоўшчыкам пры будаўніцтве жылых дамоў грашовых сродкаў фізічных асобаў магчыма толькі на аснове дагавораў стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва, а таксама шляхам выпуску жыллёвых аблігацый з улікам дагавораў (пагадненняў), заключаных паміж эмітэнтам і фізічнай асобай, што прадугледжваюць абавязацельствы эмітэнта па будаўніцтве жылых памяшканняў уладальнікам жыллёвых аблігацый у адпаведнасці з заканадаўствам. Гэта абумоўлена тым, што некаторыя забудоўшчыкі заключаюць з грамадзянамі дагаворы інвеставання будаўніцтва кватэр, а не дагаворы стварэння аб'ектаў долевага будаўніцтва. «Пры гэтым імі ігнаруецца той факт, што згодна з Інвестыцыйным кодэксам Рэспублікі Беларусь пад інвестыцыйнай дзейнасцю разумеецца ўкладанне інвестыцый з мэтай атрымання прыбытку, у той час як будаўніцтва жылля ў большасці выпадкаў ажыццяўляецца для паляпшэння грамадзянамі жыллёвых умоў», — растлумачылі ў прэс-службе Прэзідэнта. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы маюць права накіроўваць забудоўшчыку ў якасці дольшчыкаў канкрэтных грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У выпадку калі такое накіраванне адсутнічае, забудоўшчык мае права прымаць гэтых грамадзян у межах устаноўленай квоты з ліку тых, хто звярнуўся ў парадку чаргі. Дольшчык мае права ўступіць свае правы па дагавору блізкім сваякам, кола якіх вызначана. Указам прадугледжана, што ў выпадку, калі новы дольшчык мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, забудоўшчык павінен пералічыць яму кошт 1 кв.м у адпаведнасці з цаной, устаноўленай для такіх грамадзян у гэтым жылым доме. Прыняцце ўказа не запатрабуе выдзялення дадатковых бюджэтных сродкаў.

БЕЛТА.

БЕЛАРУСЫ І МАСКВІЧЫ СТВАРЫЛІ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЮ ПЕРАМОГІ

Кнігу «Энцыклапедыя Перамогі. Беларусь — Масква» прэзентавалі напярэдадні Дня Незалежнасці ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі». Новае выданне — сумесны праект Міністэрства інфармацыі Беларусі і ўрада Масквы, прысвечаны юбілейным датам вызвалення Беларусі, Вялікай Перамогі і 75-годдзю ўсталявання звання Герой Савецкага Саюза. У 800-старонкавай энцыклапедыі змяшчаюцца гістарычныя нарысы пра пачатковы этап вайны, пра партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі рэспублікі, пра асноўныя этапы вызвалення Беларусі, а таксама пра прысваенне звання Герой Савецкага Саюза ўраджэнцам нашай краіны.



«Энцыклапедыя Перамогі. Беларусь — Масква» выйшла накладам у 3 тысячы асобнікаў, з якіх недзе каля 2 тысяч прыбудзе ў Беларусь, а астатняя частка тыражу застанецца ў Расіі.

Першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ высока ацаніла кнігу «Энцыклапедыя Перамогі. Беларусь — Масква»:

— Гэта вельмі значны інфармацыйны дзяржаўны праект. Некалі плячо ў плячо, не разбіраючыся, дзе беларус, дзе рускі, дзе казах, дзе грузін, людзі абаранялі нашу краіну. І сёння, калі будуецца новая гісторыя новай Беларусі, такія выданні павінны быць даступныя для шырокіх колаў насельніцтва, каб не толькі ветэраны бачылі, што гісторыя клапатліва і свята шануецца ў нашай краіне, а каб гэта маглі пачытаць і маладыя людзі, якія будуць працягваць пачатыя бацькамі і дзядамі справы.

Як расказала **дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі» Таццяна БЯЛОВА**, пакуль паступленне новай энцыклапедыі ў бібліятэкі не плануецца, а ў крамах яна з'явіцца прыкладна ў сярэдзіне ліпеня. Калі будзе вялікі попыт на выданне, то будзе надрукаваны дадатковы тыраж.

Застаўся задаволены выданнем і **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, дырэктар акадэмічнага Інстытута гісторыі**:

— Калі мне прапанавалі паўдзельнічаць у праекце, я адразу згадзіўся — і абсалютна не шкадую. Мне здаецца, што старонкі гэтай кнігі звернуты ў будучыню, да моладзі. Тут захавана і перададзена тое, як жылі, як пераадольвалі неймаверныя цяжкасці ваеннага часу нашы ветэраны.

На прэзентацыі кнігі прысутнічалі Героі Савецкага Саюза Іван Кустаў, Васіль Мічурын, Віктар Ліванцаў, а таксама **ўдзельнік вызвалення Мінска акадэмік Ігнацій АНТОНАЎ**. Дарэчы, Ігнацій Антонаў калісьці ўдзельнічаў у святочных мерапрыемствах у самую першую гадавіну вызвалення Мінска:

— Урад БССР запрасіў мяне на першую гадавіну вызвалення Мінска ў складзе дэлегацыі ад 3-га Беларускага фронту. А зараз — 65-ая гадавіна. Гэта значыць, 64 гады прайшло, і я ўдзячны лёсу, што дажыў да гэтага часу. Калі пачалося вызваленне роднай Беларусі і мне дазволілі вярнуцца ў сваю вёску (а там ніводнай хаты не было, усё спалена), то мне там расказалі, што бацьку павесілі немцы, бо ён быў старшынёй калгаса і верным камуністам, маці і сястру (пра нараджэнне якой я і не ведаў, бо служыў у войску) пагналі немцы. І пры наступленні на Мінск у мяне быў такі стан, што хацелася зрабіць усё магчымае, каб адпомсціць за родных...

Павел БЕРАСНЕЎ.

Стваральнікі новага выдання і героі Вялікай Айчыннай вайны.

ЯНЫ ЖЫВУЦЬ У РОЗНЫХ КРАІНАХ, АЛЕ ВЫЗВАЛЯЛІ БЕЛАРУСЬ УСЕ РАЗАМ

Ветэраны з краін СНД і далёкага замежжа сабраліся ў сталічным музеі Вялікай Айчыннай вайны, каб пазнаёміцца з экспазіцыяй музея і, вядома ж, пагутарыць адзін з адным, узгадаць падзеі больш як 65-гадовай даўніны. Хаця прыехалі яны з розных краін — Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі, Ізраіля, Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі — але іх звязвае адно: усе яны калісьці вызвалялі Беларусь ад фашысцкіх захопнікаў.

На гэтай інтэрнацыянальнай сустрэчы прысутнічаў і **Павел БАРАДЗІН, дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі**.

— Я катэгарычна супраць таго, каб перапісвалася гісторыя. Траціна беларусаў, вялізная колькасць расіян, казахаў, грузінаў, узбекаў і прадстаўнікоў іншых народаў аддалі жыццё за нашу будучыню, таму перапісваць гісторыю — гэта блюзнерства. Гэтага рабіць нельга. 3 ліпеня — гэта вялікае свята не толькі для Беларусі, але і для ўсяго чалавецтва. Беларусь — вялікая краіна, якая абараніла ўвесь наш народ, стала магутным шчытом... Нізкі паклон Беларусі...

Віктар ЕРМАКОЎ, генерал арміі:

— Я прыбыў сюды ў складзе расійскай дэлегацыі ад Міністэрства абароны і ветэранаў узброеных сілаў. Я стаўлюся да беларускага народа са шчырай і глыбокай павагай. І свята гэтае лічу не толькі беларускім, але і маім. Бо мой бацька тут ваяваў, мне выпадала служыць. Я проста люблю гэтую краіну.

Барыс ФЕДМАН з Ізраіля:

— Пра Беларусь можна казаць бясконца, бо беларусы — гэта народ, які заўсёды быў і застаўся чалавечным. Гэта вельмі важна. Вы заўсёды ставіліся добра да габрэяў, мы ведаем, што ў Беларусі ніколі не было пагромаў.

Васіль ВАСІЛЁНАК, жыхар Смаленска:

— Сам я з 1929 года. У 1942 годзе, калі мне было 13 гадоў, я ўжо быў усю зіму на перадавой. Потым мы адступалі, потым зноў наступалі — і я прайшоў шляхамі вайны пры вызваленні Смаленшчыны, Беларусі, Літвы, Кёнігсберга. Я быў проста салдатам, рабіў усё, што патрабавалася для Перамогі. Я практычна замяняў дарослага салдата, якіх на фронце так не хапала. А я дапамагаў. Нас выхавалі ў 30-я гады — «Гатоў да працы і абароны» — і мы, усе хлопцы, рваліся ў бой. Мяне як сірату камісар дывізіі ўладкаваў у армію, і я з 1942 года і да Перамогі быў у войску.

Раман ЯГЕЛЬ, прэзідэнт Саюза ветэранаў войскаў польскіх, прэзідэнт Саюза інвалідаў Другой сусветнай вайны (ваяваў на тэрыторыі Беларусі, быў паранены пад Леніно ў складзе Першай дывізіі імя Касцюшкі):

— Я вельмі рады, што прыехаў на гэтую гадавіну. Перамога дала нам магчымасць застацца жывымі, калі б не перамаглі — не было б Еўропы. Так што гэта вялікі дзень не толькі для Беларусі і беларускага народа. Жадаю вам усяго найлепшага, каб жылі тут шчасліва і радасна.

Аляксей САРОКІН, старшыня Каардынацыйнага савета «Міжнароднага саюза «Садружнасць грамадскіх аб'яднанняў ветэранаў (пенсіянераў) незалежных дзяржаў»:

— Я непасрэдны ўдзельнік вызвалення Беларусі. У 1944 годзе ў 10 кіламетрах на поўнач ад Віцебска мы прайшлі ў бок Прыбалтыкі і выйшлі на Палангу. Таму ўсіх удзельнікаў, якія маюць дачыненне да вызвалення Беларусі, сардэчна віншую з гэтым вялікім святам. Беларускі народ змог пасля страшэннай разрухі аднавіць рэспубліку. І колькі разоў выпадае бываць на Беларусі — кожны раз бачу, як краіна паўстала. Не ў крыўду іншым краінам СНД, аднак на іх фоне Беларусь выглядае вельмі добра: па сацыяльных пытаннях, па пенсійным і медыцынскім абслугоўванні ветэранаў, па клопаце пра іх.

Юлюс Лёнгінас ДЭКСНІС, старшыня рэспубліканскага камітэта Літоўскай арганізацыі ўдзельнікаў Другой сусветнай вайны:

— Тут праходзіла і вызваляла беларускую зямлю нашая 16-ая літоўская стралковая чырванасцяжная клайпедская дывізія. У гэтай дывізіі я служыў радавым байцом-разведчыкам. Мы праходзілі праз Полацк, Гарадок і да мяжы з Літвой. Я адчуваю вялікую радасць за Беларусь, бо за яе вызваленне ваявалі мае аднагодкі, мае саслужыўцы, ваявалі гэтак жа геаічна, як і за сваю літоўскую зямлю. Я ганаруся тым, што мяне запрашаюць на такія святы. У краінах Балтыі ёсць выпадкі праяўлення нацызму, але ў Літве гэта не так праяўляецца. Бо Літва па сваім складзе і гістарычным мінулым больш прыязна ставіцца да іншых нацыянальнасцяў і не сімпатызуе нацысцкім праяўленням. А калі яны і бываюць, то мы, наша арганізацыя, у якой зараз каля шасці тысяч членаў, падаём голас пратэсту, і наш народ нас падтрымлівае. Напрыклад, мы абураемся тым, што нядаўна наш сейм прыняў закон, які забараняе насіць сімволіку Савецкага Саюза і нацысцкай Германіі. Мы лічым, што паставіць гэтыя дзве сімволікі ў адзін рад — гэта абраза пачуццяў ветэранаў, якія вялі непрымірымую барацьбу з гэтым злом чалавецтва — фашызмам. Таму мы таксама выражаем свой пратэст, і вось гэты закон дапоўнены тлумачэннем, паводле якога ветэранам, якія заслужылі савецкія ўзнагароды, дазволена падчас святаў іх насіць. У нашых школах Другую сусветную вайну вывучаюць вельмі павярхоўна і, я сказаў бы, тэндэнцыйна. Павінна быць па-іншаму. Але як будзе далей — залежыць ад складу ўрада, але пакуль мы жывыя — будзем змагацца за праўду, бо як бы ні хацелі трактаваць гісторыю па палітычных матывах, яна ўсё адно скажа сваё слова і сваю праўду.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Фотаздымкі з урачыстасцяў Яўгена ПЯСЕЦКАГА, Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і БЕЛТА.

ДЗЕЦІ ЧЭКІСТАЎ НАМАЛЯВАЛІ РАДЗІМУ

Урачыстае пасяджэнне і святочны канцэрт, прысвечаны Дню незалежнасці Беларусі і 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адбыліся ў клубе імя Ф.Э. Дзяржынскага з удзелам кіраўніцтва Камітэта дзяржаўнай бяспекі, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і органаў дзяржбяспекі, членаў праўлення Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар». Прысутных павіншавалі з надыходным святам старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Вадзім ЗАЙЦАЎ і ветэран вайны, удзельнік парада Перамогі 1945 года ў Маскве, палкоўнік у адстаўцы Мікалай ЖУКАЎ.

На мерапрыемстве былі падведзены і вынікі дзіцячага конкурсу твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Я малюю Беларусь — маю радзіму», прысвечаную Году роднай зямлі і 65-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За перамогу ў конкурсе змагаліся 105 удзельнікаў ва ўзросце ад 5 да 16 гадоў — дзяцей супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі. У намінацыі «Выяўленчае мастацтва» адзначаны работы Наталлі Загаеўскай (1 месца), Елізаветы Волк (2 месца) і Кацярыны Шамчук (3 месца), а ў намінацыі «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» — Таццяны Кучаравай (1 месца), Дыяны Лаўшук (2 месца) і Мікалая Горбача (3 месца). Дарэчы, бацькі пераможцаў працуюць ва ўпраўленні ваенна контрразведкі, 14-га асобнага палка урадавай сувязі, а таксама ўпраўленняў КДБ па Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцях.

Святлана БАРЫСЕНКА.

СВЯТА НА ВУЛІЦАХ МІНСКА

Вызваленне як запавет

Пераможны мір і спакой у жыцці беларусаў назаўжды застанецца з прысмакам горычы. Горычы страты, якую зведала ці не кожная сям'я. Такое не забудзецца ніколі. І гэты дзень — нагода клапатліва перабраць успаміны, асэнсаваць усё з вышыні гадоў і з гэтым багажом рухацца далей. Услухаемся ў гісторыі сучасных беларускіх палітыкаў — якія запаветы варта перадаць нашчадкам...

Сяргей МАСКЕВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД:

— Я ведаю пра вайну перш за ўсё па аповедах бацькоў. З таго часу, як сябе памятаю, слухаў іх жудасныя ўспаміны. Пра тое, колькі людзей было расстраляна і спалена ў суседняй вёсцы Забор'е... Пра тое, як дзясяткі дамавін везлі праз нашу вёску на могілкі...

А пасля, падчас студэнцтва, мы з таварышамі актыўна займаліся пошукавай работай, збіралі матэрыялы для гісторыкаў, якія даследавалі вайну. У зімовы час на лыжах выпраўляліся ў паходы па месцах баявой славы, сустракаліся з самімі ўдзельнікамі баявых дзеянняў, даследавалі партызанскі рух. Колькі мы наслухаліся жыццёвых гісторый пра беды і подзвігі... А яшчэ творы Быкава давалі яркае ўяўленне пра той час... Дзень вызвалення асаблівы яшчэ і таму, што гэта кропка адліку. Можна і трэба супастаўляць, што было да вызвалення, у якім стане знаходзілася краіна і як жылі людзі, і што каштавала гэтым жа людзям, што выжылі, вынеслі вайну, перамаглі, аднавіць краіну. Гэта плоскасць, у якой у вельмі павялічаным выглядзе можна пабачыць, адчуць гора, пакуты і ўсвядоміць цану незалежнасці. Пачынаючы ад гэтага водападзелу можна ацэньваць, чаго дасягнула Рэспубліка Беларусь сёння, дзякуючы працы, розуму, таленту людзей. І мы можам параўноўваць сябе ў гэтым плане з другімі, і радавацца, як многага мы дасягнулі. 65 гадоў — гэта такі адрэзак часу, калі яшчэ ёсць жывыя сведкі, якія вынеслі на сваіх плячах усе нягоды таго часу, заваявалі незалежнасць, сваёй працай аднавілі краіну і змаглі пабачыць той прагрэс, што ёсць у рэспубліцы. Вельмі важна, каб тое, што напасілі гэтыя людзі і ў справах, і ў памяці, усімі існымі сродкамі было транслявана ў будучыню. Каб іх душэўныя перажыванні, эмоцыі таксама засталіся ў памяці нашчадкаў.

Валянціна ЛЯВОНЕНКА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД.

— Мая маці была пагнана ў Германію, бацька ваяваў у складзе 2-га Украінскага фронту, пад камандаваннем Конева. У Беларусі дагэтуль — 65 гадоў прайшло з вызвалення — настолькі шануюць памяць пра тых, хто аддаў сваё жыццё за вызваленне краіны. Гэта вельмі дарагога каштуе, асабліва на фоне краін—суседак, дзе пераглядаецца гісторыя, перапісваюцца яе старонкі, узводзяцца помнікі фашысцкім паслугачам, нацысцкім брыгадам. А наш народ настолькі свята ставіцца да старонак сваёй гісторыі, што гэта сапраўды заслугоўвае найвялікшай павагі. І гэта адзначаюць многія народы, і паважаюць нашу краіну таму, што тут створаныя такія механізмы, якія не дазволяць нават падняць галаву гэтым нацысцкім прыхільнікам. І 3 ліпеня да нас прыязджаюць ветэраны з іншых рэспублік, яны вам скажуць, наколькі для іх радасна, што дагэтуль, пасля 65 гадоў вызвалення краіны, у Беларусі бяражліва і трапятліва адносяцца да ўсіх сімвалаў, звязаных з той парой... А ім важна ведаць, што іх гераізм, адвага, іх ахвяры зразуметыя і прынятыя народам. Гэты дзень — нагода паглядзець на сябе: наколькі мы вартыя таго, што зрабіла для нас пакаленне нашых бацькоў і дзедаў, як бы пафасна гэта ні гучала. Сёння мы так даражым уласным жыццём, што нам цяжка ўявіць, што калісьці быў час, калі для людзей ўласнае жыццё было на другім плане, а на першым — свабода краіны. І дзеля гэтай свабоды жыццём асабістым гатовыя былі ахвяраваць. І гэта маральная вышыня, якая была ў душы воінаў тых гадоў, гэта тая планка, якой сёння маладыя людзі павінны дасягнуць. Прылаўкі мы насыцім, трэба сфарміраваць душу, каб ва ўнутраным свеце знаходзілася месца для разумення таго, што радзіма даецца ад Бога і гэту радзіму мы павінны абараняць і берагчы.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Зямля пад божымі крыламі

Малітва за беларусь

Урачыстыя богаслужэнні, прысвечаныя 65-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прайшлі ўчора ў сталіцы. Спачатку ў архікатэдральным касцёле імя Найсвяцейшай Панны Марыі службу вёў **Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архібіскуп Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ**.

— Успамінаючы словы Ісуса, які казаў: «Там, дзе двое ці трое сабраліся ў маё імя, я знаходжуся сярод іх», сёння мы молімся за ўсіх тых, хто ўдзельнічаў у вайне і абараняў нашу радзіму ад ворага, — зазначыў Мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч. — Мы павінны памятаць пра іх і прасіць благаслаўлення Божага — каб ніколі гэта не паўтарылася. Каб мы навучыліся бачыць у кожным чалавеку свайго брата, сваю сястру, нягледзячы на розніцу ў веравызнаннях. Мы жывём на адной зямлі і ў нас адзін Бог. І сёння, калі свету пагражаюць выклікі бязвер'я і абыякавасці, гэта вельмі актуальна. Трэба задумацца над тым, што будзе з намі заўтра.

А палове дзявятай служба распачалася ў Свята-Духавым кафедральным саборы, якую ўзначаліў **Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі ФІЛАРЭТ**.

— У перамозе ў гэтай вайне немалая доля належыць Царкве, — падкрэсліў Уладыка Філарэт. — Памятаючы словы св. Патрыярха Сергія, які ў дзень пачатку Вялікай Айчыннай вайны напісаў свой зварот да народа і заклікаў усіх стаць на абарону сваёй Айчыны, сёння мы здзейснілі малебен, падчас якога ўспаміналі ўсіх святых беларускай зямлі. Дзякуй Богу, свята 65-ай гадавіны будзе радасным, светлым і вартым таго подзвігу, які здзейсніў наш народ.

Ілья ЛАПАТО.

ВАЙНА ВАЧЫМА ДЗІЦЯЦІ

(Працяг.
Пачатак у нумары за 2 ліпеня.)

Акрамя таты, у дзядулі былі яшчэ тры сыны — вайсковыя афіцэры. Недзе ў красавіку-маі дзядуля дае тэлеграму ад імя майго таты, што ён пры смерці. Прыехалі ўсе. Мама казала, што яны ведалі, што будзе вайна... Потым да дзядулі нечакана прыйшоў паліцай і стаў патрабаваць, каб той аддаў пісталет, які нібыта дзядулю пакінулі сыны. А дзе ён яго возьме? Дзядулю пачалі біць, ён так крычаў, што мы выскачылі з хаты і пачалі плакаць. Мама схапіла нас, запіхнула назад у хату, а дзядуля ўсё крычаў. Яму паламалі косці, разбілі галаву. Праз некалькі дзён ён памёр... Пазней да нас ізноў прыйшлі немцы і стараста і пачалі патрабаваць у мамы, каб яна аддала татаву вопратку. А дзе ж яе ўзяць, калі ўсё ўжо раздалі пераапрануцца салдатам. Яны пачалі крычаць на маму і пагражаць, што павязуць у Чавусы. Я так спужалася, што маму павязуць забіваць, так крычала і рвала на сабе валасы, што яны пасмамі ляцелі. Адзін паліцай, відаць, не вытрымаў, падышоў да мяне і пачаў угаворваць, што маму нікуды не павязуць. Мама тады зразумела, што рана ці позна, але здарыцца вялікая бяда. Яна пачала разносіць нас па суседзях, каб калі раптам што — хоць хто-небудзь з нас застаўся жывы. Нас немцам не выдалі, хаця тата быў не толькі старшыня калгаса, але і камуніст, мы з усімі людзьмі прайшлі разам далейшыя жахі, але засталіся жывымі.

Шлях у невядомае

У канцы верасня 1943 года я раніцай бегла ад бабулі, якая жыла на іншай вуліцы, і пачула, што ў пасёлку Лужок, што за рэчкай, крычаць жанчыны, брэшуць сабакі. Заходжу ў хату — там мама дзярэ бульбу на сняданак, я ёй расказваю, і мы выбягаем. Мама спужалася, пачала будзіць малых. І праз хвілін 20 заходзяць два немцы з сабакамі, «ком, ком» крычаць, паказваюць апранацца і выходзіць. Мама плача, мы ўсе плачам, выходзім у двор, а там ужо ўсе суседзі. Немцы паказваюць ісці наперад і вядуць на вуліцу, дзе жыла бабуля, і там таксама людзі стаяць. Мы падбеглі да бабулі і дзядулі. Ніхто нічога не разумее, што крычаць немцы, жанчыны і дзеці плачуць. Потым прыехала машына з паліцаямі. Нам усім загадалі вярнуцца па хатах, запрэгчы коней, у каго ёсць, узяць толькі неабходнае, дзяцей пасадзіць на калёсы. На ўсе пра ўсё — палова гадзіны.

Усе разбегліся. Мама пабегла таксама, а мы засталіся ў бабулі. Каня ў нас не было, у дзядулі былі толькі калёсы, таму ён аб'яднаўся з суседкай — там села бабулька з двума ўнукамі і нашая бабуля з трыма ўнукамі, а я, сястра, мама і дзядуля, пайшлі пехам. З сабой мама прыхапіла для нас паліто, адну байкавую коўдру, старое футра — гэта нас і ўратавала ў канцлагеры. Бабуля ўзяла харчы. Пагналі нас у напрамку вёскі Астравы. Людзі галосяць, жанчыны плачуць, паліцаі сцябаюць бізунамі жанчын. І раптам завароч ваюць падводы на луг да ракі. Тут ізноў падняўся крык, бо ўсе падумалі, што будуць расстрэльваць і тапіць. Аднекуль з'явіліся яшчэ немцы і паліцаі, сталі хапаць дзяўчат, маладых жанчын і кідаць іх да падлеткаўхлопцаў. Старэйшай сястры маёй было 13, мама піхнула яе, накрыла коўдрай і пасадзіла наверх нас. Яна і засталася. Я бачыла, як у маёй хроснай Веры Казловай і суседкі Матроны Савосцівай вырвалі з рук малых дзетак Валодзю і Мішу і закінулі ў натоўп. Пад'ехалі грузавыя крытыя машыны, туды сталі запіхваць моладзь. Людзі былі ашалелыя з аднаго і другога боку — і матулі, і дзеці, якіх звозілі. Гэтае відовішча нельга апісаць...

Колькі мы ехалі — я не памятаю, але калі пераязджалі вялікі мост у Быхаве, я так крычала, бо мне здавалася, што за мостам ужо жыцця не будзе. Там нас падзялілі на 2 часткі: адну адправілі налева, другую направа. Усю восень і зіму нас ганялі з месца на месца. Прыганялі ў якую-небудзь вёску, рассялялі па 30-40 чалавек у адну хату. Я памятаю вёскі: Кавалі, Шыхаў, Саланое... А ў Жарабцах раніцай пачалі праводзіць аблавы на дзяцей. Адвозілі іх у Бабруйск і там бралі кроў для сваіх параненых. Спачатку бралі толькі хлопчыкаў, а потым сталі хапаць і дзяўчатак. Мама старэйшую сястру Марыю садзіла ў рускую печ і закладвала торфам. А мы, астатнія, былі яшчэ малыя, такіх не бралі. Аднойчы раніцай у хату ўвайшлі стараста і немец — і скамандавалі мне ісці. Я, зразумела, заплакала, але мяне выратавала тое, што на падбародку ў мяне былі болькі, бабуля іх «вогнік» называла. Немец круціў галавой, што не трэба, а стараста яму даказваў, што гэта хутка лечыцца. Я не магла ні слова сказаць, ні варухнуцца. Усё-такі немец махнуў рукой і яны пайшлі. Бабуля мне пасля таго спецыяльна болькі не лячыла.

Маму і дзядулю кожны дзень прымушалі капаць акопы. Кармілі іх адзін раз. А мы заставаліся адны. Нешта з ежы нам прыносілі мясцовыя людзі, нешта вартавыя нашы мамы, нешта са свайго пайка пакідалі мама і дзядуля. Аднак, калі і выпадала паесці, то адзін раз на дзень. Коней і калёс тады ўжо ў нас не было, я не памятаю, куды яны падзеліся, нас гналі ўжо сваім ходам. І калі б не было з намі бабулі і дзядулі, то маці не змагла б нас зберагчы. Дзядуля заўсёды нёс Надзю, бабуля — Мішу, а мама — Лёшу.

Нас заўсёды суправаджалі, гналі на працу немцы Вілі і Ганс. У мамы вельмі кружылася галава, яна не магла падняцца і не пайшла капаць акопы. Дзядулю па старасці ўжо некалькі дзён як вызвалілі ад гэтага абавязку. Ганс падышоў да мамы і скамандаваў устаць. Мама, хістаючыся, паднялася, а ён хацеў ударыць яе палкай. Але дзядуля схапіўся за палку — і немец пачаў яго біць па галаве. Дзядуля закрываўся рукамі — немец паламаў яму ўсе пальцы, нават палку зламаў. Дастаў пісталет і хацеў стрэліць у дзядулю, аднак Вілі чамусьці схапіў яго за руку і не даў стрэліць. Так дзядуля застаўся жывы.

Азарычы

У канцы студзеня — лютым нас павярнулі ў адваротны бок і зноў пагналі — у вёску Саланое. Загналі ў хлеў разам з нямецкімі коньмі, аднак на працу ўжо не ганялі і нікога не кармілі. Жылі мы ў такіх умовах некалькі дзён — жабравалі, а потым нас ізноў пагналі. Куды і навошта — ніхто не ведаў. Людзі так знядужалі, што не маглі ісці. Шмат хто ішоў басанож, тых, хто падаў — прыстрэльвалі. Ішлі доўга, некалькі дзён. Уздоўж дарог ляжалі мёртвыя людзі, а мы ўжо ішлі і не разумелі, куды ідзём і што з намі будзе.

Скамандавалі спыніцца. Наўкола — калючы дрот, вышкі з кулямётамі, нейкі малады лес ці балота. Пры ўваходзе сталі адбіраць больш дужых старых і забралі нашага дзядулю. Маці крычала, а мы ўжо не маглі плакаць. Было шмат людзей: хто ляжаў проста на зямлі, хто сядзеў, уздоўж плота людзі ляжалі адзін на адным — я думала, яны так спяць, а бабуля сказала, што яны мёртвыя. Не было нават сухога месца, снег падтаў і стаяла суцэльная грязь. Бабуля падвяла нас да маленькага дрэва, нахіліла яго, мама села з аднаго боку, узяла Лёшу, з другога боку — Мішу, а мы прыціснуліся з усіх бакоў, а побач — нашы землякі. Ніхто не раскладваў вогнішчы, бо былі забаронена, ніхто ні з кім не размаўляў. Людзі былі закручаныя ў анучы, нават твараў не было бачна, не чутно плачу дзяцей, а толькі стаяў суцэльны стогн — гэта хворыя на тыф стагналі ў трызненні.

У нас не было ніякай іншай вопраткі, не было ніякіх запасаў ежы. Бабуля знайшла недзе яшчэ не з'едзеныя сасновыя іголкі і сказала нам, старэйшым, іх жаваць. Высмоктваць і выплёўваць. Гэта неяк ажывіла. Нам нават есці не хацелася, мы не прасілі ні есці, ні піць. Якая дата была, калі нас туды прыгналі, — я не ведала і не памятаю, ды і наўрад ці з нашых хто памятае...

Шмат хто адразу ж захварэў на тыф. Я памятаю, як недалёка да нас жонка майго хроснага Настасся Аляксеенка з двума дзецьмі захварэла. Яна была ў трызненні ў той дзень, калі памерлі двое яе дзяцей. Мая бабуля з яшчэ адной жанчынай цягнулі дрэва ці кусцік, ён як быццам бы вырываўся — і туды запіхвалі дзіцячыя цельцы. Маці тая выжыла, але амаль згубіла розум. Пазней памерлі яшчэ дзеці ў Фядоры Меляшковай, Соф'і Яраслававай — гэта з тых, хто быў побач з намі.

Паміралі кожны дзень — трупы ляжалі наўкола, калі-некалі іх сцягвалі кудысьці. Мы згубілі лік дням і начам. Бабуля нас увесь час прымушала маліцца, каб бацька вярнуўся, а тут мы ўжо не маліліся — і словы забылі, і моцы не было. Іншы раз сабакам немцы кідалі нешта падобнае на хлеб, але ні мама, ні бабуля ўжо не маглі туды бегчы. Дарослыя казалі, што мы там былі сем дзён. Я не памятаю. А памятаю толькі, што мы ні разу не елі, а брудную ваду бабуля працэджвала праз хустку і давала нам.

Таццяна ЛІСКОВА.

(Заканчэнне будзе.)

Хочаце пачытаць партызанскія часопісы?

Выстава «Беларусь партызанская» адкрылася ў сталічным музеі Вялікай Айчыннай вайны. Яна з'яўляецца апошняй, трэцяй часткай праекта «Беларусь. Трыумф пераможцаў» — трохі раней музей прэзентаваў выставы, прысвечаныя трафеям вайны і наступальнай аперацыі «Багратыён».

Новая выстава адкрывае для наведвальнікаў калекцыі партызанскіх рукапісных часопісаў, а таксама калекцыю прадметаў выяўленчага мастацтва — малюнкаў і карцін. Рукапісны часопіс у гады вайны выпускаўся шмат у якіх партызанскіх атрадах і брыгадах, у ім партызаны занатоўвалі ўсе старонкі свайго жыцця — ад афіцыйных дакументаў да карыкатур, ад апісання подзвігаў загінулых таварышаў да спісаў святочных датаў. У красавіку 2009 года рашэннем Рэспубліканскай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны музейнай калекцыі рукапісных часопісаў была прысвоена катэгорыя «1», г.зн. каштоўнасці міжнароднага значэння. Дарэчы, якраз калекцыя гэтых партызанскіх часопісаў уразіла пасла Яе Вялікасці Каралевы Вялікабрытаніі ў Беларусі спадара Найджэла Гоўлд-Дэвіса, які на нядаўняй навукова-практычнай канферэнцыі казаў пра магчымасць прэзентацыі такіх унікальных экспанатаў для заходняй публікі. На сёння калекцыя налічвае 248 экзэмпляраў.

Былая партызанка Валянціна Аляксееўна АЛЕКСАНДРОВІЧ разглядвае малюнкі сваіх паплечнікаў-партызан.

Дарэчы, на адкрыцці выставы прысутнічала Вольга Іванаўна Малышава, жонка знакамітага партызана, Героя Савецкага Саюза Фёдара Аляксеевіча Малышава, які зусім нядаўна пайшоў з жыцця. Дык вось, Вольга Іванаўна паабяцала перадаць усе ордэны і медалі свайго мужа ў калекцыю музея Вялікай Айчыннай вайны.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЯПОНІЯ ХОЧА ВЯРНУЦЬ САБЕ КУРЫЛЫ?

Верхняя палата японскага Какая (парламента) 3 ліпеня аднагалосна прыняла закон, які прызнае астравы Ітуруп, Шыкатан, Кунашыр і архіпелаг Хабамаі неад'емнай часткай Японіі і заклікае прыняць меры па іх вяртанні.

РФ лічыць, што названыя астравы ўваходзяць у склад расійскіх Курыльскіх астравоў, спасылаючыся на вынікі Другой сусветнай вайны. Японскі бок паказвае на Сімодскі трактат аб гандлі і межах — першая расійска-японская дамова, падпісаная ў 1855 годзе. Паводле гэтага дакумента, мяжа паміж краінамі праходзіць паміж астравамі Ітуруп і Уруп, і, такім чынам, названыя тэрыторыі «з'яўляюцца японскімі».

У МАСКВЕ АБАМУ БУДУЦЬ АХОЎВАЦЬ ЗНІШЧАЛЬНІКІ

Спецслужбы і праваахоўныя органы Расіі прымаюць беспрэцэдэнтныя меры бяспекі ў сувязі з візітам 6-8 ліпеня ў Маскву прэзідэнта ЗША Барака Абамы.

У дзяжурным рэжыме будуць знаходзіцца ваенна-паветраныя сілы Маскоўскага ваеннай акругі. «Некалькі дзясяткаў знішчальнікаў будуць знаходзіцца на баявым дзяжурстве на аэрадромах. Акрамя таго, паветраная прастора Маскоўскага рэгіёна будзе абвешчана беспалётнай зонай», — адзначыў прадстаўнік спецслужбаў.

АРСЕНАЛ І 200 ЛІТРАЎ МАРЫХУАНЫ

Падчас вобыску ў 44-гадовага жыхара вёскі Старцава Арлоўскай вобласці знайшлі дзве 100-літровыя пластыкавыя бочкі, шчыльна набітыя марыхуанай.

Усяго ў бочках, якія стаялі ў склепе сярод нарыхтовак на зіму, было 25 кілаграмаў наркотыку высокай якасці. Таксама ў затрыманага знайшлі 31 куст канапель. Для іх вырошчвання ён спецыяльна абсталяваў аранжарэю, у якой былі лямпы дзённага святла, спецыяльнае абсталяванне падтрымлівала тэмпературу і вільготнасць паветра, а да чыгуноў з каноплямі былі падведзеныя люлечкі для аўтаматычнай падачы ўгнаенняў. Таксама ў доме была знойдзеная міліцэйская форма з маёрскімі пагонамі, 2 пісталеты, пісталет-кулямёт саматужнай вытворчасці, абрэз і паляўнічая стрэльба, пяць гранат, пяць дэтанатараў, патроны. Затрыманы ніколі не служыў у праваахоўных органах.

ПОМНІК ШАКАЛАДУ

У Расіі ў горадзе Пакроў Уладзімірскай вобласці адкрылі помнік шакаладу.

Помнік у выглядзе трохметровай бронзавай феі з шакаладкай у руцэ ўсталявалі ў скверы непадалёку ад гарадскога музея шакаладу. Па звестках кампаніі Kraft Foods, якая прафінансавала стварэнне скульптуры, гэта першы ў свеце помнік названаму прадукту.

НА БАКУ ДАБРА

Вайна, якая была ў жыцці... Вайна, якая паўплывала на мастацтва — прыгаварыла людзей ствараць... Тых, што самі ваявалі і ведаюць, што такое разбурэнні — іх загартавалася, нарадзіўшы праўдзівыя словы пісьменнікаў, мастацкія вобразы на карцінах, у кіно і тэатры. Столькі гадоў прайшло, а яны і зараз зразумелыя, жывыя, нібыта ўся энергія чалавечых душ, якія перайшлі ў лепшы свет, з'ядналася і ўварвалася ў творы. Нішто не знікае бясследна. І людзі. І надзеі. І думкі. У гэтыя дні людзі мастацтва разважалі пра тое, як вайна паўплывала на іх жыццё, свядомасць, творчасць.

Прафесар, мастак Віктар ГРАМЫКА ў гэтыя дні прыгадаў свае ваенныя дарогі, якія адлюстроўваў на палатне:

— Роўна праз тры гады і адзін дзень пасля чорнай даты 22 чэрвеня 1941 года пачалася аперацыя «Багратыён», якая адкрыла шлях да вызвалення Беларусі. Гэта была тая аперацыя, якую меў на ўвазе адзін з вядучых генералаў фашысцкага вермахта, калі расказаў у сваёй кнізе пра гібель трэцяй танкавай арміі, якая не ведала паражэнняў. Гэтая аперацыя, дзе ўсё было разлічана і гітлераўцаў падманулі, скіраваўшы іх увагу ў іншы бок, стала сімвалам вялікіх перамог — яна вызваліла тысячы кіламетраў нашай роднай зямлі, якая ляжала ў руінах. Не толькі майстэрства і сіла зброі нашай арміі забяспечылі перамогі аперацыі «Багратыён». Мне давялося прайсці складаны ваенны шлях: я быў у падпольнай арганізацыі Заслонава, пасля гэтага ваяваў у смаленскім партызанскім палку, пачаўшы кулямётчыкам і стаўшы камісарам атрада. Давялося ваяваць на Смаленшчыне, у розных рэгіёнах Беларусі. Плячо ў плячо я ваяваў з адным чалавекам, імя якога вядома сёння ў сувязі з радаснымі падзеямі. Гэта Міхаіл Ягораў, разведчык, з якім мне давялося есці з аднаго катла і курыць з аднаго кісета. Вось дзіўна і сімвалічна, што сцяг перамогі над рэйхстагам разам з Кантарыя ўзняў ён, рускі чалавек, былы беларускі партызан. Гэта вялікі знак велічы нашай перамогі. Я хачу ў гэты дзень павіншаваць усіх нашых партызан. Нас паменшала. Нам не заўсёды проста прыйсці і расказаць пра тое, якая была вайна ў Беларусі — узрост ставіць свае перашкоды. Але я ўдзячны тым людзям, што шляхам мастацтва звяртаюць людзей у мінулае, якое не забытае. Хачу павіншаваць ветэранаў і людзей мастацтва з той свабодай, якая нам дае права вольна і натхнёна працаваць. Мы загартаваныя, таму, пераадольваючы складанасці сённяшніх дзён, можам ісці да далейшага будаўніцтва нашай Айчыны.

Алесь САВІЦКІ, былы партызан, франтавік, у мірны час абраў шлях літаратара і не святкаванні 65-годдзя вызвалення Беларусі ў Доме літаратара падтрымаў словы міністра абароны Беларусі Леаніда Мальцава пра неабходнасць захавання гістарычнай памяці праз творы мастацтва:

— Людзі майго пакалення былі народжаныя з нетаканнем бараніць сваю зямлю. Яны клаліся ў зямлю, былі гатовыя загінуць за яе, разумеючы, што ў іх, магчыма, не будзе нічога — ні сёння, ні заўтра. Не будзе ні ўнукаў, ні праўнукаў. У іх застанецца толькі адно — велічы іх святога подзвігу, які яны здзейснілі на гэтай зямлі. Наш абавязак — памяць пра іх. Згодны з Генадзем Пашковым, які пісаў: «Калі новыя пакаленні будуць будаваць сваё жыццё трывала, так, якія ставяць сваім героям помнікі, якія «магільнай аб'яты травой» — ніхто не пераможа гэтую дзяржаву ніколі. Ніякі чужы бот, які ступіць на гэтую зямлю, назад ужо адсюль не вернецца. Такі запавет гэтай зямлі. Тое, што мы сёння святкуем 65-ю гадавіну з Дня вызвалення роднай Беларускай зямлі — гэта яшчэ адзін напамінак аб тым, што найвялікшая наша святыня — наша Перамога — заўсёды з намі. Мы, ветэраны, якія яшчэ жывыя, і новыя пакаленні павінны не толькі берагчы гэтую памяць, а ўсяляк даводзіць нашчадкам, што больш значнай святыні, чым перамога ў барацьбе за волю і незалежнасць роднай зямлі, не існуе. А яна ў нас ёсць. Пакуль мы жывыя, мы будзем казаць сваё пісьменніцкае слова, узвялічваючы гонар, славу, веліч нашай зямлі, волю нашай Бацькаўшчыны, нашага краю. У гэты дзень мы будзем святкаваць наша вызваленне і адчуваць, што новыя пакаленні будуць верныя гэтаму святому салдацкаму абавязку. Яны пойдуць па нашых слядах, захаваюць гэтую памяць, а значыць захаваюць вольнай і незалежнай нашу Радзіму.

Мікалай ПІНІГІН, мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр тэатра імя Янкі Купалы, лічыць, што трэба суадносіць тэму і час:

— У нас былі планы рабіць спектакль пра мінскае гета. Але калі мы пачалі вывучаць матэрыялы, то ў мяне валасы дуба сталі. Я не думаю, што гэта нехта вытрымае ў зале. Памятаеце фільм «Ідзі і глядзі»? Ён геніяльны, але па-за межамі мастацтва. Ён мае амаль што фізіялагічнае ўздзеянне, ты потым не можаш жыць. Я думаю, што калі пра гета ставіць спектакль, то гэта будзе цяжкай праўдай і жудаснай. У мяне была такая думка, але мы не змаглі зрабіць п'есу. Таксама былі перамовы са Святланай Алексіевіч — нас зацікавілі яе «Апошнія сведкі». Але тое, што спрацоўвае ў літаратуры, у дакументальнай прозе, таксама складана перадаць у тэатры. Па той жа прычыне: так жудасна, што вельмі цяжка вытрымаць. Мы думалі пра «Бліндаж» Васіля Быкава... Але ў рукі трапіў Алесь Адамовіч — і я зразумеў, што гэта трэба рабіць. Аповесць «Нямко» — цудоўны матэрыял. Мне не хацелася б, каб у спектаклі на ваенную тэму па сцэне поўзалі людзі з аўтаматамі. А ў Адамовіча ёсць вечная тэма: маладыя людзі, якія кахаюць адно аднаго, ён немец, а яна беларуская дзяўчына — нібыта Рамея і Джульета. Каханне іх разгортваецца на фоне вайны, яны ў самой вайне існуюць. Мне цікава ўжо тое, што хлопец-гітлер-югенд пастраляў сваіх салдат, каб выратаваць беларускую дзяўчыну. Як заўсёды ў добрай літаратуры, гэта не пра вайну, а пра людзей. Вайна — гэта абставіны, у якіх людзі апынуліся не па сваёй волі, але яна вельмі жорстка выяўляе людзей. Аповесць Адамовіча і яго сцэнарый — гэта драматургія. У такіх творах павінна быць нейкая аснова, лепш — каханне. І мяне не хвалюе, што ёсць мастацкі фільм. Мы зробім сваю версію.

Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, народны мастак Беларусі, у вайну служыў у кавалерыі — пра гэта можна даведацца, паглядзеўшы на яго творы. Але ў гэтыя дні Леанід Дзмітрыевіч прымае віншаванні яшчэ і з тым, што ён вылучаны на прэмію Саюзнай дзяржавы, асабліва падкрэсліўшы значэнне мірнай тэмы:

— Так, вайна была часткай майго жыцця і, безумоўна, паўплывала на яго. Працы на тэму вайны я стаў пісаць адразу, як паступіў і стаў вучыцца мастацтву. А пасля паступова я стаў пераходзіць на мірную тэму, на тое, чым жыла краіна. Гэта мне здавалася больш цікавым і значна больш адпавядала духу мастацтва, якое павінна несці прыгажосць і гармонію. Не скажу, што адышоў ад ваеннай тэматыкі зусім — пасля яна вярнулася, і ў 60-я гады я напісаў карціну «Маё нараджэнне». Твор не адлюстроўваў літаральна маё нараджэнне — гэта было ўвасабленне нараджэння майго пакалення, якое вымушана было перажыць вайну, застацца жывым і працягваць жыццё. Гэтую карціну паказалі на Усесаюзнай выставе ў Маскве. Памятаю, што людзі падыходзілі, калі падзяліцца ўражаннямі, выказвалі нейкія думкі, дзяліліся ўспамінамі. Дарэчы, у Маскве гэтую працу прынялі лепш, чым дома. Напэўна, удалося выказаць нешта такое, што можа зачапіць нават тых, хто далёкі ад тых падзей, якія я перажыў асабіста. Але ў мастацтве ваенная тэма — не галоўная для мяне. Пасля вайны на гэтую тэму створана вельмі шмат карцін рознымі мастакамі. Але для развіцця мастацтва, на маю думку, больш важна адлюстроўваць рэчы, якія будуць хваляваць людзей заўсёды, бо нясуць супакаенне, радасць, нейкія новыя веды пра краіну і яе асобаў. Ёсць прыгожыя людзі ў нас, сама краіна прыгожая. Для мяне як мастака мірнае жыццё больш важнае, чым вайна.

Пісьменнік Віктар КАРАМАЗАЎ напярэдадні адзначыў свой асабісты юбілей, прыгадаў, як вайна паўплывала на яго творчасць:

— Я належу да пакалення дзяцей вайны. Таму ў сваёй творчасці я не абышоў тэму вайны. Менавіта свае дзіцячыя перажыванні я перадаў у рамане «Бежанцы». У ім сапраўды адлюстравана маё жыццё — сем гадоў мне было ў 41-м годзе. Памяць захавала той жах, у якім раптам апынулася столькі людзей адначасова. Я выдатна адчуваў ужо, што такое бегчы ад ворага, каб уратавацца. І ўсё тое, што адбываецца ў рамане з галоўным героем Васілём, адбывалася са мною: дарогі бежанства, страта бацькоў, бамбёжкі, ваенныя дарожныя нягоды... Напэўна, гэты дзіцячы досвед страсяніў свядомасць так, што потым хацелася падзяліцца з іншымі. Былі яшчэ ў мяне апавяданні на тэму вайны, пісаў нешта ў дзённіках успамінаў, якія друкаваліся ў «Нёмане». На маё пакаленне вайна сапраўды наклала моцную пячатку. Чым вызначалася маё пакаленне? Мы прайшлі жыццёвую жорсткую школу — тыя, хто быў у акупацыі і хто не быў у акупацыі. Усё адно на вачах былі смерці, пакуты, голад — усяго хапала. Галоўнай мэтай было — выжыць. Маё пакаленне — пакаленне жорсткіх экстрэмальных умоў, якое ведае цану стратам. Менавіта таму ў ім моцнае імкненне да лепшага, жаданне ствараць лепшае самім.

Сяргей ЧЭКЕРЭС, акцёр Нацыянальнага тэатра імя Горкага, ужываючыся ў ролю салдата ў спектаклі «Я твая нявеста», шмат разважаў пра адчуванне вайны сённяшняй моладдзю:

— Што асабліва важна зразумець, калі глядзіш творы на ваенную тэму: перад табой людзі. І людзі сапраўды ўсё гэта вытрымлівалі, яны паміралі. Для маладых сёння важна разумець, што вайна — гэта не проста зброя, гэта зброя, якая забівае. У наш час людзі ў маладым узросце цікавяцца смерцю, шукаюць нейкі адрэналін, драйв. А тады ніхто нічога не шукаў. Проста настала вайна — вось табе і драйв... І круціся... Людзі пастаўлены ў такія абставіны, што не могуць сабой распараджацца, за іх нехта ўсё вызначыў, парушыўшы ўсе планы, разбурыўшы надзеі. І тое, што яны змагаліся, ведаючы, што, магчыма, памруць — сапраўды гераізм. Я глядзеў адну перадачу, дзе былі такія развагі: а ўласна, што такое вайна? Экстрэмальная форма жыцця — і ўсё. Вось таму важна гаварыць сёння пра тое, як чалавек адаптуецца да такіх «экстрэмальных умоў» — спачатку баіцца, а потым звярэе і кажа: «Не, так не будзе!» — і пачынае адстойваць, змагацца за сябе. І ў канчатковым выніку сцвярджае боскую задуму ў сабе і ў свеце. Гэта быў сапраўдны Армагедон. І ў гэтым выпадку добра перамагло зло. Таму праца над такімі ролямі патрабуе ад нас шчырасці і сапраўднай крыві, не імітацыі, а самаддачы. Мы гэтага не ведаем, так не жывём, але павінны зразумець, што рухала людзьмі, якія змагаліся на баку дабра.

Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.

ВЕТЭРАНЫ СПАРТЫЎНАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ АТРЫМАЛІ ЎЗНАГАРОДЫ

У Нацыянальным алімпійскім камітэце Беларусі 2 ліпеня, у Міжнародны дзень спартыўнага журналіста, ушаноўвалі ветэранаў.

Віцэ-прэзідэнт НАК трохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр Мядзведзь і гендырэктар ТАА «МТС» Уладзімір Карповіч павіншавалі прызнаных карыфеяў пяра, мікрафона, фота- і відэакамер і ўручылі памятныя падарункі Ніне Пракаповіч, Маргарыце Міхайлавай, Юрыю Валошыну, Мікалаю Петрапаўлаўскаму, Уладзіміру Сарокіну і Мікалаю Шостаку. Акрамя таго, каштоўныя падарункі ад ТАА «МТС» атрымалі вядомы тэлекаментатар Уладзімір Навіцкі і спартыўны аглядальнік газеты «Звязда» Алена Кравец, якія нядаўна адзначылі юбілейныя дні нараджэння.

БЕЛТА.

ТРЫ НА АДНАГО

Дырыжор Аляксандр Анісімаў умее спраўляцца з трыма аркестрамі адначасова.

Гэта ён дакажа 5 ліпеня, калі на сцэне Палаца Рэспублікі адбудзецца канцэрт-прысвячэнне вызваленню Беларусі. Творы абраныя адпаведныя. 7-я сімфонія Дзмітрыя Шастаковіча, так званая «ленінградская», у якой кампазітар здолеў перадаць супрацьстаянне дзвюх сілаў, у якой прадчуваў перамогу. Таксама прагучыць «Паэма агню» Аляксандра Скрабіна, саліраваць у якой будзе піяніст Андрэй Сікорскі, і «Балеро» Марыса Равэля.

Але галоўнае інтрыгуючае супрацьстаянне гэтага вечара — адзін дырыжор з музыкантамі трох аркестраў краіны: Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі, сімфанічнага аркестра Вялікага тэатра оперы і балета, і Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Трыста музыкантаў адначасова — як тут дабіцца суладдзя і гармоніі, каб стварыць музыку? Напэўна, у маэстра Анісімава ёсць сакрэт. Таму што пяць гадоў таму ўжо быў канцэрт так званага аб'яднанага аркестра Мінска, які складаўся з трох калектываў. Падзея надоўга запомнілася публіцы. Ліпень 2009, на думку Анісімава, павінен увайсці ў гісторыю музычнай Беларусі, таму што ёсць асаблівая нагода. Грандыёзнае свята — значыць і музыка павінна гучаць грандыёзная і грандыёзна.

Ларыса ЦІМОШЫК.

СЁННЯ

Месяц

Поўня 7 ліпеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Георгія, Максіма, Паўла.*

К. *Альжбеты, Мальвіны, Андрэя, Інакенція.*

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.44	21.43	16.59
Віцебск —	4.26	21.41	17.15
Магілёў —	4.34	21.33	16.59
Гомель —	4.40	21.21	16.41
Брэст —	5.01	21.56	16.55
Гродна —	5.11	21.48	16.37

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Футбол

Фота Пятра ФАМІНА.

Адна перамога на дваіх

Беларускія футбольныя клубы «Дынама» (Мінск) і МТЗ-РІПА згулялі першыя матчы кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы.

«Дынама» дома перамагло македонскую «Рэнову» з лікам 2:1 (фота). На 41-й хвіліне гульні Ібраімі вывеў гасцей наперад, а на 72-й хвіліне Сяргей Кісляк зраўняў лік з пенальці. На 88-й хвіліне матча навабранец дынамаўцаў Алег Страхановіч забіў пераможны гол. Мінскі МТЗ-РІПА ў гасцях у чарнагорскага клуба «Суцьеска» звёў матч унічыю — 1:1. На 49-й хвіліне матча Дражан Меджадавіч адкрыў лік, а на 77-й Антон Бубноў аднавіў раўнавагу. Зваротныя паядынкі 1-га круга кваліфікацыі пройдуць 9 ліпеня.

Ул. інф.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Цяльцам варта запасціся цярпеннем, а Шалям могуць адкрыцца новыя перспектывы

ВАЕН. Варта ажыццявіць самыя патаемныя планы і задумы. Аднак некаторыя з іх давядзецца злёгку падкарэктаваць — у залежнасці ад развіцця падзей. Пастарайцеся не прымаць паспешлівых рашэнняў: дайце сабе час для разважання і абдумвання. Пажадана рабіць гэта ў адзіноце.

ЦЯЛЕЦ. Дайце людзям вакол вас больш свабоды выбару, не ціскніце на іх аўтарытэтам. Цярпенне пераможа ўсё. Не адкладвайце справы дзеля задавальнення пагутарыць з чалавекам, якога даўно не бачылі, — гэта можа стаць вельмі вялікай памылкай.

БЛІЗНЯТЫ. Важна засяродзіцца. Толькі логіка і здаровы сэнс збераруць вас ад легкадумных учынкаў, таму не перашкаджайце ім працаваць, забіваючы галаву ўсякай бязглуздзіцай. Разлічвайце сілы адэкватна, не перанапружвайцеся.

РАК. Стрыманасць, засяроджанасць і сціпласць — вось тыя якасці, якія дазволяць дасягнуць максімальнага поспеху па ўсіх кірунках. Знойдуцца рашэнні найбольш важных пытанняў. Пры нязначных намаганнях усё будзе атрымлівацца нібы само па сабе.

ЛЕЎ. Тыдзень не вельмі спрыяльны для праяўлення гаварлівасці — лепш звесці колькасць размоў да мінімуму. Творчы парыў станоўча паўплывае на кар'еру. Пастарайцеся не ўпадаць у крайнасці: перапады настрою могуць не пайсці на карысць справе.

ДЗЕВА. Сабярыцеся і ў адзіным творчым парыве завяршыце тое, што яшчэ не завершана. І як прыемна будзе пахваліць сябе за гэта. Пастарайцеся вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць, мірным шляхам. Будуць хваляваць дробязі, але часам менавіта з іх пачынаюцца вялікія справы.

ШАЛІ. Падзеі будуць развівацца ў спрыяльны для вас бок, нечакана могуць узнікнуць новыя перспектывы. Пастарайцеся не адмаўляць у дапамозе сябрам, калі вы ў сілах дапамагчы. А вось дрэнны настрой лепш трымаць у цуглях, каб пазбегнуць непатрэбных праблем.

СКАРПІЁН. Цудоўны тыдзень для смелых і энергічных дзеянняў. Спрыяльная абстаноўка для творчых дасягненняў у прафесійнай галіне. Не давядзецца асабліва задумвацца над тым, што рабіць і як сябе паводзіць — вы цудоўна ўсё ведаеце, сумненні вас не хвалююць.

СТРАЛЕЦ. Ад калег можна даведацца шмат новага. У першай палове тыдня чакае ўдача ў справах. Варта задумацца аб дадатковай працы, якая пашырыць вашы магчымасці ў фінансавым плане. Ёсць небяспека пераацаніць сваю значнасць — тыдзень не вельмі падыходзіць, каб гаварыць пра сябе, з кім бы вы ні гутарылі.

КАЗЯРОГ. Прадстаўнікі знака, якія прывыклі да цяжкасцяў, змогуць атрымаць карысць ад свайго службовага становішча, выкарыстоўваючы сваю прывабнасць і дыпламатычныя здольнасці. Промахі на працы застануцца без наступстваў, варта толькі захоўваць спакой і не стамляцца паўтарыць сабе, што ўсе перамены — выключна да лепшага.

ВАДАЛЕЙ. Неабходна засяродзіць увагу на рабоце з фінансавай дакументацыяй. Можа ўзнікнуць шэраг перашкод, пераадолець якія будзе даволі цяжка. Адказныя справы і сустрэчы лепш перанесці на другую палову тыдня. Вельмі спатрэбіцца цярпенне.

РЫБЫ. Галоўная задача — знайсці ўзаемаразуменне з навакольнымі. Знаходзячыся ў стане канфлікту, вы наўрад ці зможаце зрабіць хоць штосьці карыснае для сябе. Новыя справы лепш пачынаць у сераду, тады будзе спадарожнічаць удача.

«Да Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі...»

Ёсць у хрысціянскіх краінах звычай наведваць цудадзейныя мясціны свайго краю — украінская Кіева-Пячорская лаўра, французскі Лурд, польскі Ліхень — тыя пункты на карце, дзе былі зафіксаваны цуды аздараўлення душы і цела. Ёсць такія месцы і ў Беларусі: Бялынічы, Жыровічы, Лагішын, Тракелі, Рось, Будслаў... Стагоддзямі няспынным патокам сюды ішлі людзі. Адны — падзякаваць Богу за дар аздараўлення ў хваробе, другія — папрасіць гэтага дару, трэція свой шлях ахвяроўвалі за блізкіх, чацвёртыя выкарыстоўвалі час пілігрымкі як малітву і пошук адказаў на хвалюючыя душу пытанні. Пешшу ў Будслаў першы раз два гады таму прыйшоў і я. Гэта была «XII пешая пілігрымка Нарач—Будслаў». Тры дні дарогі. Тры дні спеву і малітвы. Летась нарачанская пілігрымка ў Будслаў стала другой у маім жыцці...

ДАРОГА

...Напераднік пілігрымкі — крыж, сімвал любові і збаўлення. Яго нясуць па чарзе. Мы ідзём праз вёску і мясцовыя жыхары праводзяць нас у шлях позіркамі надзеі. Столькі сэнсу ў адным толькі позірку! І любоў, і просьба, і бласлаўленне.

Вось падышла бабуля і працягнула адной з дзяўчат невялічкую паперку: у ёй друкаванымі літарамі бабуля напісала сваю просьбу.

«Занясіце, дзеткі, да Маці Будслаўскай. Бо сама я не дайду, старая ўжо. Застануся тут маліцца...»

Пілігрымка з Нарачы з касцёла Св. Андрэя апостала традыцыйна выходзіць 29 чэрвеня. Якраз у гэты дзень адзначаецца свята Святых Пятра і Паўла. Шлях як бы і не далёкі (Будслаў — вёска таго ж раёна), але ўсё адно займае тры дні. Столькі ж, да прыкладу, ідуць пілігрымы з Вілейкі. Рэкардсменамі ж ужо каторы год застаюцца Баранавічы, вернікі з гэтага горада ідуць дзевяць дзён...

Але ёсць і не зусім звычайныя пілігрымкі. Веласіпедная і водная, скажам. Альбо т.зв. пакутная пілігрымка, якую некалькі гадоў таму арганізаваў ксёндз Уладзіслаў Завальнюк, (пробашч касцёла Св. Сымона і Алены ў Мінску). У гэтай пілігрымцы пяць дзён вернікі ідуць на хлебе і вадзе...

...Нашым падарожжам да Марыі кіруюць манахі кармеліты босыя. Разам з імі наша група налічвае каля 180 чалавек. Сустрэць тут можна вернікаў і з другіх прыходаў — Засвір, Шэметава, Канстанцінава, Свір, Гродна, Мінск, Мядзел, Навагрудак, Астравец, Гудагай.

Наша дарога — гэта спеў. Кожны пілігрым, акрамя жоўтай хустачкі з фірмовым надпісам «Нарач—Будслаў» (у кожнай пілігрымкі колер хустачкі свой), мае таксама і спеўнік. У ім усе асноўныя песні, якія спяваюць пілігрымы па дарозе. «Дзякуем, Марыя, за тваю любоў, цябе, Маці, славіць і наш дружны хор. З Нарачы мы пешшу да Цябе ідзём, і шчырыя сэрцы мы табе нясём!»

— Летась у Будслаўскім фэсце ўзялі ўдзел каля 30 тысяч пілігрымаў, з якіх тры тысячы вернікаў прыйшлі ў Будслаў пешшу, — кажа айцец-кусташ Нацыянальнага санктуарыя Маці Божай Будслаўскай а. Віктар Бурлака. — Увогуле з года ў год пілігрымаў прыходзіць усё больш і больш — гэта вельмі радуе.

...Наша дарога ўвесь час змяняецца. Асфальт, пясок, гравійка. Калі пачынаецца гравійка, ісці становіцца крыху цяжэй — «засядаюць» ногі. Тым не менш некаторыя з пілігрымаў наўмысна здымаюць абутак — ідуць босымі. І хоць каменьчыкі, якімі скрозь усыпаная дарога, і коляцца, на гэта ўвага не акцэнтуецца. Сваю пакуту чалавек ахвяроўвае за блізкіх. Знаёмы хлопец Іван — за хворага брата, дзяўчынка Таня — за бацьку-п'яніцу. Гравійка цягнецца некалькі кіламетраў...

Прывалы ці невялікія перапынкі цягнуцца звычайна паўгадзіны. Тут можна перакусіць, змяніць намазолены абутак і крыху адпачыць.

Паступова спякотнае сонца змяняе халодны дождж. Мы крочым у цішыні — час на ўнутраную рэфлексію. У дажджавіках і пад парасонамі мы не спыняемся, мы ідзём, крок за крокам. І Будслаў усё бліжэй.

І ЛЮДЗІ

— Па дарогах Беларусі ідуць пілігрымы, ідуць да Маці Божай Будслаўскай, бо вераць у яе дапамогу, вераць у тое, што па яе просьбе Езус учыніць новы цуд, перш за ўсё — цуд навяртання, — сказаў пра пілігрымаў Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч. — Пілігрымы ідуць і даюць сведчанне, што і ў нашым няпростым свеце ёсць тыя, хто мае надзею ў Богу і Яму давярае сябе. Трэба ісці і не баяцца падзенняў. Як кропка ў тэксце пісьма не з'яўляецца яго завяршэннем, бо заўсёды можна дадаць яшчэ адзін сказ, так і падзенне — гэта не канец, бо з дапамогай Марыі яно можа стаць пачаткам шляху да святасці. Трэба не баяцца і пусціць Ісуса ў сваё сэрца і жыццё, каб яно станавілася святым і дасканалым.

Нарачанская пілігрымка адметная тым, што ў ёй ідзе шмат моладзі і дзетак. У Марыны, маёй нарачанскай знаёмай, гэтая пілігрымка ўжо дзясятая па ліку. У Будслаўскі санктуарый дзяўчына першы раз прыйшла васьмігадовай дзяўчынкай...

...У Будславе збіраецца некалькі дзясяткаў тысяч вернікаў. Кожны з іх прыехаў і прыйшоў са сваёй просьбай і падзякай. Сярод іх напісаная вялікімі літарамі на кавалку паперы была і просьба нарачанскай бабулі: «Божа, беражы Беларусь ад усялякага зла. Блаславі сваіх дзяцей і адары супакоем...».

Ілья ЛАПАТО, фота аўтара.

Усміхнёмся!

Поўдзень, мора, пляж. Муж павольна ўваходзіць у ваду.

Жонка:

— Як там вада — цёплая?

Муж:

— Градусаў дваццаць.

Жонка:

— Я ў цябе не пытаюся, колькі там градусаў! Я кажу, вада цёплая або халодная?

Муж:

— Цёплая.

Жонка:

— А колькі градусаў?

☺

Мой персідскі кот зрабіў на маім персідскім дыване персідскі заліў!

☺

Флірт па-ўкраінску:

— Ульяна, ты цыбулю ясі?

— Ем.

— А сала ясі?

— Ем.

— Ты ж мая ласуха!

☺

Добрая рэч камп'ютар. Пасядзеў пяць хвілін — паўтары гадзіны прайшло...

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы